Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

15 ЛЮТАГА 2023 г.
СЕРАДА
№ 30 (29910)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ДВОЙЧЫ ПРАЗ АГОНЬ? МОЖНА!
4

ЛЮДЗЕЙ РАТАВАЛА ВОЗЕРА
13

## КАРОТКА

- **Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ аб кібербяспецы.**
- Самалёт з беларускімі ваеннымі медыкамі вылецеў у Сірыю для дапамогі пацярпелым ад землетрасення.
- **З моманту ўключэння першага энергаблока БелАЭС у энергасістэму выпрацавана 11,7 млрд кВт·г.**

## ЦЫТАТА ДНЯ

**Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр:**

*«У лістападзе мінулага года на палях форуму «Атамэкспа» ў Сочы падпісана міжурадавае пагадненне аб абыходжанні з адпрацаваным ядзерным палівам. У Беларусі цяпер праводзіцца адпаведная працэдура па яго ратыфікацыі. Што да сумеснага праекта па атамнай станцыі, то за апошнія месяцы адбылося нямала пазітыўных падзей у яго рэалізацыі. 9 лістапада 2022 года першы энергаблок уключаны ў сетку і ўстойліва працуе на намінальнай магутнасці. Летась было выпрацавана 4,69 млрд кВт•г, што дало магчымасць нашай краіне сэканоміць значную колькасць спажытага прыроднага газу. З моманту яго ўключэння ў аб'яднаную энергасістэму 3 лістапада 2020 года выпрацавана практычна 11,7 млрд кВт•г. Ідуць работы па другім энергаблоку. Ажыццяўляюцца ўсе мерапрыемствы этапу фізічнага пуску. Спадзяёмся, што першае ўключэнне ў сетку адбудзецца ў сакавіку гэтага года з выхадам на этап энергетычнага пуску».*

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «УЛАСНАСЦЬ, ГРОШЫ І ЎЛАДА — ТРЫ КІТЫ. ГЭТА ГАЛОЎНАЕ Ў ЛЮБОЙ КРАІНЕ»

## Па кожным пытанні на нарадзе з кіраўніцтвам Саўміна ад Прэзідэнта прагучала жорсткая крытыка

Фота БелТА.

**Пашырэнне функцый цэнтраў па абслугоўванні бюджэтных арганізацый, фінансаванне дзяржаўных тэатраў, механізм далучэння нізкаэфектыўных сельгасарганізацый да дзяржпрадпрыемстваў і фінансавае становішча Мінскага аўтамабільнага завода — пытанні, якія актыўна абмяркоўваліся на нарадзе Прэзідэнта Беларусі з кіраўніцтвам Савета Міністраў. Тэмы абраныя невыпадкова. На кожнай з іх падрыхтаваныя адпаведныя праекты ўказаў. Але перш чым прымаць канчатковыя рашэнні, трэба ўважліва разгледзець усе нюансы.**

«У нас склалася добрая традыцыя, можна сказаць, — раіцца па найважнейшых пытаннях, якія ўнесены на вырашэнне Прэзідэнта. Праекты падрыхтаваны, некаторыя пытанні па гэтых праектах ёсць. Я хацеў бы атрымаць удакладняльныя і дадатковыя адказы на іх. Нам трэба будзе разгледзець некалькі важных эканамічных пытанняў, прыняць па іх аптымальныя для дзяржавы рашэнні», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка, адкрываючы нараду.

Па кожным з вынесеных на парадак дня пытанні кіраўнік дзяржавы выказаў жорсткую крытыку. Ён не пагадзіўся з шэрагам прапанаваных у дакументах падыходаў. Прэзідэнт аргументавана і на канкрэтных прыкладах указаў адказным асобам на павярхоўны падыход пры падрыхтоўцы важных дакументаў.

### Першае пытанне — работа цэнтра па абслугоўванні бюджэтных арганізацый.

На разгляд Прэзідэнта быў вынесены праект указа па пашырэнні функцый цэнтраў па абслугоўванні бюджэтных арганізацый. Урад прапануе дадаць цэнтрам работы: павялічыць колькасць і пашырыць пералік бюджэтных арганізацый, якія абслугоўваюцца, даць магчымасць прадстаўляць інтарэсы арганізацый у судах, выступаць заказчыкамі пры будаўніцтве. Аляксандр Лукашэнка пацікавіўся перадгісторыяй пытання, удакладніў, як наладжана работа гэтых цэнтраў і наколькі правільным было рашэнне аб іх стварэнні.

Міністр фінансаў Юрый Селівёрстаў расказаў, што раней гаспадарчыя групы і бухгалтарскія службы былі ў кожнай дзяржустанове. Але з мэтай цэнтралізаваць гэтую работу ў 2020 годзе былі створаны спецыяльныя цэнтры па абслугоўванні бюджэтных арганізацый, яны і сталі займацца іх бухгалтэрыяй, забеспячэннем, тэхабслугоўваннем і іншымі пытаннямі. Сёння ў краіне пры выканкамах працуе 181 такі цэнтр, які абслугоўвае больш як 9 тысяч арганізацый. «Сёння нам не трэба ў кожнай школе мець бухгалтара, спецыяліста па закупках, юрыста, без якога гаспадарчую дзейнасць ажыццяўляць нельга. Цяпер такія людзі знаходзяцца ў цэнтры і могуць ажыццяўляць гэтыя функцыі для рознай колькасці арганізацый», — растлумачыў Юрый Селівёрстаў.

СТАР. 2

Працоўны старт

# Лясны сакрэт Лізаветы

**«Я стаю на дарозе, каля ног круцяцца медзведзяняты, а насупраць з канавы ўстае на задніх лапах мядзведзіца... Я як стаяла, трымаючы ў руках тэлефон, так і засталася, перастала дыхаць, у думках развіталася з роднымі і заплюшчыла вочы...». Малады спецыяліст Тумілавіцкага вопытна-вытворчага лясніцтва Лізавета Каштальян працуе ўсяго паўгода, але ўжо паспела пазнаёміцца не толькі з «зялёнай кухняй», але і з асобнымі яе жыхарамі.**

СТАР. 12

# НЕДЗІЦЯЧЫЯ ГУЛЬНІ

## Як не трапіць у розныя надзвычайныя сітуацыі

**На наступным тыдні для малодшых школьнікаў — а дакладней вучняў першых і другіх класаў — запланаваны дадатковыя зімовыя канікулы. Паколькі трэцяя чвэрць навучальнага года самая працяглая, ужо не першы год маленькім навучэнцам даецца магчымасць зрабіць паўзу і перадыхнуць. А паколькі адпачываюць дзеці па-рознаму, самы час нагадаць хлопчыкам і дзяўчынкам, а таксама іх бацькам аб правілах бяспекі.**

СТАР. 3

# «УЛАСНАСЦЬ, ГРОШЫ І ЎЛАДА — ТРЫ КІТЫ. ГЭТА ГАЛОЎНАЕ Ў ЛЮБОЙ КРАІНЕ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Прэзідэнт выказаў сумненні ў тым, што прынятыя меры прынеслі чаканы эфект. У яго таксама ўзніклі пытанні да юрыдычнага боку: фактычна цэнтры існуюць пры выканкамах, але яны выведзены з іх структуры. Таму незразумела, каму яны падпарадкоўваюцца. Аляксандр Лукашэнка сказаў, што на свае вочы хоча ўбачыць, як гэта працуе ў адным з раёнаў. «Цэнтралізавалі — гэта правільна. Сабралі ў кучу — калі ласка. Але пажадана, каб цэнтралізацыя была матываванай. Калі вы цэнтралізавалі і напалову скарацілі — добра. Не дай бог, я паеду ў райвыканкам і ўбачу там хоць адну закавыку не так», — папярэдзіў ён.

Прэзідэнт падкрэсліў, што гэтыя цэнтры павінны знаходзіцца ў непасрэдным падпарадкаванні старшыні выканкама і не дубліраваць функцыі іншых структур, напрыклад, упраўленняў на капітальным будаўніцтве, якія таксама знаходзяцца ў падпарадкаванні мясцовых органаў улады.

«Пачынаем хамутаць на тым, што яшчэ не адпрацавана. Не прапрацаваўшы, выпіхваць на Прэзідэнта напрамак дзейнасці ў цэлай краіне. Час ужо не фармальна падыходзіць да гэтага пытання. Таму разбірайцеся і потым уносьце прапановы, каб гэта было жорстка выбудавана пад выканкам. У нас выканкамы сёння не перагружаныя, яны часам не ведаюць, чым займацца. Самае галоўнае, як нашы новаўвядзенні, якія мы плануем, адаб'юцца на дзейнасці новаўключаных бюджэтных арганізацый. Асабліва ў рэгіёнах павінны быць крокі, і мы павінны ад гэтых крокаў атрымліваць эфект», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка даручыў Камітэту дзяржаўнага кантролю вывучыць на месцах работу цэнтраў па абслугоўванні бюджэтных арганізацый, праманіторыць, наколькі эфектыўная іх дзейнасць. Адміністрацыі Прэзідэнта даручана прапрацаваць дакумент з юрыдычнага пункту гледжання і максімальна падрабязна прапісаць усе палажэнні, каб у будучыні не ўзнікала пытанняў, хто за што адказвае і каму падпарадкоўваецца.

## Другое пытанне — фінансаванне дзяржаўных тэатраў

Падчас наведвання Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы ў 2021 годзе Прэзідэнт даручыў перавесці тэатры на раўнадолевае (бюджэт плюс уласныя сродкі) фінансаванне расходаў. Якую суму трупа заробіць сваімі сіламі — столькі з дзяржбюджэту і атрымае ў якасці падтрымкі. Але на разгляд кіраўніка дзяржавы вынеслі праект новага ўказа, прапановы якога разыходзяцца з раней агучанымі патрабаваннямі.

«Якія вы яшчэ грошы ў мяне просіце? 50 працэнтаў мы даём тэатрам датацыю. Тым тэатрам практычна, якія ў 2020 годзе выступілі за знішчэнне дзяржавы. Што вы зрабілі для таго, каб выканаць маё даручэнне? — абурыўся Аляксандр Лукашэнка. У дакуменце адзначана, што прадугледжваецца раўнадолевае фінансаванне са сродкаў бюджэту і ўласных сродкаў далёка не поўных затрат тэатральных устаноў на аплату працы артыстаў і мастацкага персаналу, стварэнне новых пастановак, правядзенне гастроляў і выплату аўтарскіх адлічэнняў, узнагароджанняў.

«Вы прапануеце, каб я заплаціў за ўтрыманне і выкарыстанне ў поўным аб'ёме за кошт бюджэтных сродкаў дзяржмаёмасці тэатра, уключаючы аплату працы служачых і рабочых, камунальныя паслугі, тэхнічнае абслугоўванне будынкаў і збудаванняў, добраўпарадкаванне тэрыторыі (дрэвы буду садзіць за вас), рамонт абсталявання і транспарту. Хіба тэатр будзе пераживаць наконт транспарту, нейкага абсталявання? За гэта

Фота Белта.

ж заплацяць з бюджэту. Якое ж тут стымуляванне, — раскрытыкаваў прапанаваныя падыходы Прэзідэнт. — Мы ж сабраліся, каб лепш зрабіць. А вы мне прапануеце сёння вось гэты бардак узаконіць».

Як адзначыў старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю Васіль Герасімаў, мяркуецца, што дзяржава будзе выдзяляць тэатрам грошы толькі на пастаянныя выдаткі. Усё астатняе — колькі зарабіў тэатр, столькі даплаціў бюджэт.

«Мы будзем фінансаваць пастаянныя расходы, а ў пастаянных расходах конь не валяўся, — заўважыў Аляксандр Лукашэнка. — Дык навошта вы мне падсоўваеце гэтыя рашэнні? Мы ж дамовіліся: зарабілі мільён — мільён з бюджэту плаціце. Тады будзе зразумела: вы зарабілі больш — больш атрымалі».

Прэзідэнт падкрэсліў, што ў сённяшніх умовах неабходна вучыцца зарабляць грошы і быць эканомнымі. Ён зрабіў акцэнт на тым, што нельга безагляднa аплачваць тэатрам усе расходы. Магчыма, дзяржава можа дадаткова падтрымаць тэатры па нейкіх пытаннях, але найбольш аптымальным варыянтам Прэзідэнт лічыць раўнадолевае фінансаванне — 50 на 50. А куды ўжо тэатры будуць накіроўваць гэтыя грошы, гэта іх пытанні.

«Сядайце і думайце, як мы будзем з імі працаваць», — падсумаваў кіраўнік дзяржавы.

## Трэцяе пытанне — механізм далучэння нізкаэфектыўных сельскагаспадарчых арганізацый да дзяржаўных прадпрыемстваў

Урад прапанаваў указам Прэзідэнта ўвесці чарговыя меры па далучэнні праблемных арганізацый аграрна-прамысловага комплексу да дзяржаўных прамысловых прадпрыемстваў. Кіраўнік дзяржавы нагадаў пра сваё даручэнне пастаянна трымаць гэта пытанне ў полі зроку.

Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Ігар Брыло растлумачыў, што размова пераважна аб 127 складаных сельгасарганізацыях, з якіх 117 знаходзяцца ў трох абласцях — Гомельскай (больш за 50), Магілёўскай і Мінскай. Паводле яго слоў, у праекце ўказа прапаноўвалася замацаваць умовы для тых дзяржпрадпрыемстваў, якія возьмуцца за наладжванне работы ў нізкаэфектыўных аб'ектах АПК. Напрыклад, прадугледзець для іх агульныя рамачныя ўмовы ў частцы льгот, рэструктурызацыі запазычанасці, адтэрміноўкі па некаторых выплатах і гэтак далей. Аляксандр Лукашэнка на гэта спытаў: навошта нешта мяняць у сістэме, якая працуе, зараз ёсць механізм для таго, каб далучаць калгасы і саўгасы да прадпрыемстваў.

«Чым вас не задавальняе гэтая сістэма?» — запытаў кіраўнік дзяржавы. Напрыклад, дадатковыя ўмовы для прадпрыемстваў, да якіх далучаюць сельгасарганізацыю, можна прапісаць у распараджэнні Прэзідэнта, захоўваючы такім чынам дзейную сістэму прыняцця рашэнняў.

«Мы маем $8,3 млрд у мінулым годзе даход ад харчавання (краіна мае паступленне валюты), таму што мы ў руках трымалі сельскую гаспадарку і мадэрнізавалі яе, прыводзілі ў парадак, дысцыпліну наводзілі», — звярнуў увагу Прэзідэнт. Ён падкрэсліў, што міністэрства і ўрад, выносячы праект указа на ўзровень Прэзідэнта, недасканала прапрацавалі пытанне, каго і куды трэба далучаць, а самае галоўнае — ці патрэбны кожнаму дзяржпрадпрыемству, якое возьме шэфства над сельгасарганізацыяй, аднолькавыя льготы і прэферэнцыі. Аляксандр Лукашэнка катэгарычна аспрэчыў такі падыход «агульным чохам».

«Напэўна, агульным чохам і не атрымаецца», — адзначыў Ігар Брыло.

«Напэўна» не бывае, калі мы размову вядзём аб каштоўным прадукце ў нашай краіне, калі размова ідзе аб зямельных угоддзях, аб рэсурсах», — адказаў беларускі лідар. Ён заўважыў, што аднаму прадпрыемству, да якога далучаецца сельгасарганізацыя, ільготы патрэбныя, другому — не. У прыклад Аляксандр Лукашэнка прывёў «Беларуськалій», якому даручана ўзяць шэфства над некалькімі сельгасарганізацыямі. Але дапамога, дадатковыя прэферэнцыі ад дзяржавы ў даным выпадку непатрэбныя.

Прэзідэнт раскрытыкаваў праект указа за тое, што ён стварае ўмовы для адыходу ад персанальнай адказнасці за работу канкрэтных арганізацый. Пры існуючай сістэме кантроль больш жорсткі, асабліва ў сферы рашэнняў па пытаннях уласнасці. На этапе падрыхтоўкі распараджэнняў кіраўніка дзяржавы дакументы праходзяць праз фільтр Адміністрацыі Прэзідэнта. «Вядома, гэта трэба прайсці пэўныя бар'еры і растлумачыць, чаму вы ўносіце прапановы фактычна аб прыватызацыі, вобразна кажучы, сельскагаспадарчага прадпрыемства», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што дваты неэфектыўныя прадпрыемствы АПК у раёне — гэта зона адказнасці старшыні райвыканкама, начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі. «Вы цяпер мне гэтыя складаныя гаспадаркі, якімі я даручыў займацца вертыкалі ўлады, зараз у кучу і адводзіце ад адказнасці тых, хто за гэта павінен адказаць», — заўважыў ён.

«Я ж вам колькі разоў гаварыў: уласнасць, грошы і ўлада — тры кіты. Гэта галоўнае ў любой краіне. Вы прыйшлі ў мяне прасіць адразу прыняць рашэнне, а ў развіцці гэтага ў вас нават няма, каго да каго вы заўтра будзеце далучаць», — растлумачыў сваю пазіцыю Прэзідэнт. Ён звярнуў увагу, што пытанне магчымай прыватызацыі вельмі важнае, бо закранае інтарэсы і канкрэтнага прадпрыемства, і рэгіёна, і краіны ў цэлым. Таму ў Беларусі прадугледжана шматступеньчатая сістэма ў гэтым пытанні. «Гэта найважнейшае пытанне — уласнасць», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што ў 1990-я гады ў Беларусі паставілі надзейную заслону «прыхватызацыі». Таму да пытанняў распараджэння ўласнасцю, тым больш зямельнымі рэсурсамі, неабходна падыходзіць акуратна і ўзважана, а не агулам.

Па выніках нарады прынята рашэнне адмовіцца ад асобнага ўказа Прэзідэнта па гэтым пытанні. Кіраўнік дзяржавы даручыў на ўзроўні мясцовых улад падрабязна разабрацца ў стане спраў па кожнай з праблемных сельгасарганізацый і пры неабходнасці дадатковых рашэнняў Прэзідэнта ўносіць прапановы для падрыхтоўкі распараджэнняў кіраўніка дзяржавы.

«І не дай бог вы не аздаравіце гэтыя 127 прадпрыемстваў. І трэба яшчэ разабрацца, чаму яны такімі сталі. Разбярыцеся, а потым уносьце прапановы па кожным ці групамі па вобласці, дзе будзе пэўна распісана: гэтаму спонсару даём палёгку, гэтаму — не даём і нават два прадпрыемствы далучым», — даручыў Прэзідэнт.

## Пытанне чацвёртае — фінансавае становішча ААТ «МАЗ»

Да кіраўніка дзяржавы таксама звярнуліся з просьбай рэструктурызаваць прыкладна палову запазычанасці прадпрыемства. Аляксандр Лукашэнка адразу звярнуў увагу на вялікія аб'ёмы дэбіторскай запазычанасці — пакуль яшчэ не атрыманыя сродкі за раней пастаўленую тэхніку. Калі вярнуць у абарачэнне гэтыя грошы, то і падтрымка, магчыма, не спатрэбіцца. Трэба дакладна прапрацаваць умовы рэструктурызацыі, каб тэрміны вяртання сродкаў не былі занадта расцягнутыя. У гэтым пытанні важна ўлічваць не толькі імгненныя патрэбы прадпрыемства, але і дзяржаўныя інтарэсы. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што графік пагашэння запазычанасці павінен быць рэальны, але напружаны. «Вам подпіс Прэзідэнта патрэбны, каб я вам падарыў на 10 ці колькі гадоў гэтыя грошы. Я ж не Дзед Мароз!» — іранічна заўважыў Прэзідэнт.

У дакладах чыноўнікаў гаворка ішла аб магчымасці рэструктурызацыі на 15 гадоў. «Давай, можа, на 30», — зноў праіранізаваў Аляксандр Лукашэнка. Звяртаючыся да віцэ-прэм'ера Пятра Пархомчыка, які курыруе прамысловасць, Прэзідэнт спытаў, чаму ён падчас сваёй працы на пасадзе дырэктара БелАЗа не прасіў грошы такім чынам. «Таму што зарабляў», — адказаў віцэ-прэм'ер.

«А чаму ён не зарабляе? Чаму я павінен сёння ад іх забраць (сродкі, якія маглі б быць патрачаны на патрэбы ў іншых сферах) і вам аддаць?» — задаў пытанне кіраўнік дзяржавы.

Міністр прамысловасці Аляксандр Рагожнік заўважыў, што неабходна запусціць чарговы інвестыцыйны цыкл на прадпрыемстве, бо некалькі гадоў яно свае сродкі ў гаспадарчую дзейнасць не інвеставала. Акрамя таго, у цяперашніх умовах, у тым ліку на фоне санкцыйных абмежаванняў, ёсць унікальны шанц для актыўнай працы на расійскім рынку. «З Расіяй здолелі дамовіцца. З КАМАЗам дамовіліся. Яны ўніфікавалі ўсе вузлы. Гэта значыць, КАМАЗ робіць для МАЗа, МАЗ — для КАМАЗа. Перасталі біцца. Сёння маем допуск на рынак Расійскай Федэрацыі. Так што ў вас унікальная магчымасць працаваць, а вы прыйшлі па грошы да мяне», — заўважыў беларускі лідар.

У выніку Прэзідэнт даручыў падрыхтаваць канчатковы праект указа, але без ведамаснага падыходу і з улікам агучаных патрабаванняў.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# НЕДЗІЦЯЧЫЯ ГУЛЬНІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Самае галоўнае, на чым, дарэчы, настойваюць і ратавальнікі, — у канікулярны перыяд дзеці не павінны быць сам-насам. Пакідаць іх без нагляду дарослых увогуле не дапускаецца, бо нават самыя самастойныя і паслухмяныя часам здольныя на такое, чаго бацькі ад іх ніколі не чакалі. І шчасце, калі ўсё добра заканчваецца. Аднак, на жаль, бывае і па-іншаму...

## У лядовай пастцы

Днямі трагічная навіна ўскалыхнула інфармацыйнае асяроддзе — у Жабінкаўскім раёне патанулі двое дзяцей. Як высветлілася, браты 2014 і 2016 гадоў нараджэння. Апошні раз іх бачылі каля пяці гадзін вечара падчас гульні на вуліцы. Калі дзеці не вярнуліся дахаты, трывогу забіла бабуля хлопчыкаў. Па дапамогу яна звярнулася ў міліцыю.

Да пошукавай аперацыі падключыліся і супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. У пошуках былі задзейнічаны 12 адзінак тэхнікі і 50 чалавек. У ноч на 10 лютага, падчас абследавання тэрыторыі населенага пункта, ратавальнікі знайшлі дзяцей у штучным вадаёме глыбінёй у паўтара метра, які знаходзіцца на прысядзібным участку нежылой суседскай хаты. Хлопчыкі не падавалі прыкмет жыцця... Іх целы былі выяўлены на паверхні вады ў палонцы на адлегласці трох метраў ад берага. Таўшчыня лёду на той момант была ўсяго адзін-два сантыметры.

Аналагічная трагедыя ў мінулыя выхадныя магла адбыцца ў і Добрушскім раёне. Хлопчык, які прыехаў з раённага цэнтра да сваякоў у вёску, на свежым паветры бавіў час з сябрамі. Раптам ён вырашыў праверыць трываласць лёду на вадаёме, размешчаным за мясцовым Домам культуры. Школьнік не паспеў і вокам міргнуць, як апынуўся ў вадзе. На шчасце, сябры своечасова паднялі трывогу, у выніку чаго на дапамогу непаўналетняму паспяшаўся мясцовы жыхар. Дзіця хоць і мела патрэбу ў медыцынскай дапамозе, але яго жыццю нічога не пагражала.

Ратавальнікі і супрацоўнікі Таварыства ратавання на водах звяртаюць увагу: лёд, які яшчэ захаваўся на некаторых вадаёмах, уяўляе небяспеку. Няўстойлівае надвор'е, характэрнае для гэтай зімы, абсалютна не спрыяльнае як для забаў на лёдзе, так і для рыбалкі. Не дазваляйце дзецям адным знаходзіцца каля вадаёмаў і ў абавязковым парадку патлумачце, чым пагражае выхад на лёд.

Асновы бяспечнай жыццядзейнасці школьнікі Мінскай вобласці спасцігалі падчас рэспубліканскага конкурсу «Школа бяспекі — 2023».

## «Вузкія» месцы

Нярэдка небяспека прыходзіць адтуль, адкуль яе не чакаеш. Аднак калі ў сілах бацькоў прадугледзець некаторыя моманты, то чаму б гэтым не заняцца? У прыватнасці, не зрабіць прастору, у якой большасць часу праводзіць дзіця, бяспечнай. Асабліва гэта актуальна для сем'яў, дзе выхоўваюцца дзеці, якія толькі пачынаюць рабіць свае першыя крокі ў жыцці, а значыць, да ўсяго праяўляць цікавасць. Тут дарэчы нагадаць і пра вострыя вуглы ў інтэр'еры, і пра неабароненыя заглушкамі разеткі, і пра гарачыя напоі і стравы, якія для малых членаў сям'і павінны знаходзіцца на бяспечнай адлегласці. Ніколі не пакідайце запалкі і запальніцы ў даступных для дзяцей месцах, прыбярыце з поля зроку папулярныя сёння дэкаратыўныя свечкі. Каб не ўпусціць важныя моманты і стварыць бяспечнае асяроддзе для малых, ратавальнікі рэкамендуюць маладым бацькам прагледзець фільм МНС «Супермама».

Як ні дзіўна, але з пункту гледжання бяспекі неабходна звяртаць увагу і на цацкі. Днямі, у прыватнасці, дапамога ратавальнікаў спатрэбілася дзіцяці, якое не магло дастаць свой пальчык з адтуліны ў пластыкавай рыдлёўцы. Пры дапамозе вадкага мыла і дыэлектрычных нажніц супрацоўнікі МНС выратавалі палец хлопчыка. У медыцынскай дапамозе дзіця не мела патрэбы.

Асобная тэма — вокны. Адчыняць іх насцеж, калі ў доме расце малое, — абсалютнае табу! І не варта спадзявацца на маскітныя сеткі. Як паказвае жыццё, гэты бясшкодны на першы погляд дэвайс паспрыяў заўчаснай смерці не аднаго дзіцяці.

Акрамя таго, не забывайцеся выключаць з разеткі электрапрыборы, патлумачце сваім непаўналетнім нашчадкам, што гэта не цацкі. Няшчасны выпадак не так даўно адбыўся ў Гродне. Сямігадовы хлопчык загінуў ад удару токам з-за неасцярожнага абыходжання з фенам у ванне. Надзвычайнага здарэння не ўдалося пазбегнуць і ў Баранавічах. Падчас гульні ў хованкі на лесвічнай пляцоўцы аднаго са шматпавярховікаў сямігадовы хлопчык не прыдумаў найлепшага сховішча, чым батарэя ацяплення. Трымаючыся адной рукой за трубу, непаўналетні выпадкова дакрануўся да аголенага провада выключальніка асвятлення. У выніку хлопчык атрымаў удар токам і з электратраўмай быў шпіталізаваны ва ўстанову аховы здароўя.

У сувязі з гэтым нагадваем, што гуляць пад правадамі ліній электрапередачы строга забараняецца. Акрамя таго, нельга накідваць на іх іншародныя прадметы, залазіць на энергааб'екты, у трансфарматарныя будкі, набліжацца да абарваных правадоў. Смяротна небяспечна адчыняць электрашчыты, якія знаходзяцца ў пад'ездах дамоў. Дакранацца да электрапрыбораў мокрымі рукамі — таксама табу, да якога многія ставяцца несур'ёзна, нават не задумваючыся, чым гэта можа скончыцца.

Апошнім часам пачасціліся выпадкі траўміравання дзяцей на дзіцячых пляцоўках і ў іншых месцах — падобныя надзвычайныя сітуацыі фіксуюцца ратавальнікамі практычна штодзень. Шукаючы сабе прыгод на «пятую кропку», дзеці ў прамым сэнсе трапляюць у пастку. Некаторыя становяцца заложнікамі надзвычайнай сітуацыі па неасцярожнасці. Днямі, напрыклад, ратавальнікам патэлефанавала жанчына і папрасіла дапамогі: яе дзіця заціснула нагу ў агароджы. Здарэнне адбылося ў Клецку. Супрацоўнікі МНС, якія прыбылі на месца, высветлілі, што сямікласнік пералазіў праз металічную агароджу тэрыторыі школы — такім чынам хлопчык вырашыў скараціць шлях. У выніку ажыццявіць задуму не ўдалося: нага была заблакіравана канструкцыяй агароджы, самастойна выбрацца з «пасткі» падлетак не змог. Дапамаглі ратавальнікі.

## У зоне агню

Неабходна сачыць і за станам электраправодкі ў кватэрах, а таксама месцах агульнага карыстання шматкватэрных дамоў. У выпадку выяўлення няспраўнасцяў трэба своечасова паведаміць аб гэтым у эксплуатацыйныя арганізацыі. Вельмі важна паклапаціцца і аб пажарных апавяшчальніках, якія пажадана ўстанавіць у кожным пакоі як жылога дома, так і кватэры. У ратавальнікаў нямала прыкладаў, калі гэты прадмет інтэр'ера, што не патрабуе ад гаспадароў вялікіх выдаткаў, уратаваў жыцці цэлых сем'яў.

На жаль, і ў наш час на пажарах гінуць дзеці. Адбываецца гэта з-за бестурботнасці дарослых і з-за дзіцячага свавольства з агнём. Напрыканцы года такія гульні скончыліся гібеллю дзяцей у Барысаве. Падчас ліквідацыі пажару ў адной з кватэр шматпавярховіка выявілі трох чалавек. Усе яны — 37-гадовая жанчына, а таксама дзеці трох і сямі гадоў — знаходзіліся ў беспрытомным стане. Нягледзячы на намаганні ўрачоў, браціка і сястрычку выратаваць не ўдалося. Іх маці пазней памерла ў бальніцы. Вядома, што незадоўга да трагедыі бацькі ўжывалі алкагольныя напоі, пасля чаго заснулі. Без нагляду засталіся іх трое непаўналетніх дзяцей: трох, шасці і сямі гадоў. Малыя не прыдумалі нічога лепшага, як пагуляць з агнём. Калі ўзнік пажар, самастойна яго патушыць дзеці не змаглі. Не былі здольныя на гэта і дарослыя, якія знаходзіліся ў моцным алкагольным ап'яненні. Пакінуць моцна задымленае памяшканне, якое гарэла адкрытым полымем, змаглі толькі бацька і шасцігадовая дзяўчынка.

Многія трагедыі з агнём адбываюцца і тады, калі малыя застаюцца дома адны. Адчуўшы сябе самастойнымі, дзеці, напрыклад, спрабуюць нешта прыгатаваць. Аднак у сілу ўзросту не могуць прадугледзець некаторыя моманты, якія дазволілі б пазбегнуць пажару. Яшчэ горш, калі, застаўшыся без нагляду, непаўналетнія праводзяць з агнём «эксперыменты». У многіх выпадках трагічных наступстваў можна было б пазбегнуць, калі б побач з дзецьмі ў гэты небяспечны момант знаходзіўся хтосьці з дарослых, здольных самастойна справіцца з невялікім узгараннем, рацыянальна ацаніць абстаноўку, дапамагчы ўсім жыхарам пакінуць жыллё ў выпадку, калі патушыць агонь не ўдалося. Аднак, нават калі вы ніколі не пакідаеце сваіх дзяцей без нагляду, не будзе лішнім навучыць дзіця правільным дзеянням пры пажары, паказаць яму магчымыя выхады для эвакуацыі.

— Патлумачце дзецям наступствы гульняў з агнём, — заўважае **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — Дзеці павінны ведаць, што ў выпадку пажару ім нельга хавацца ў шафу ці пад ложак, неабходна пакідаць небяспечнае памяшканне. Ніколі не замыкайце дзверы пакоя, кватэры, хаты, дзе знаходзяцца дзеці, на ключ. Не пакідайце малых без нагляду, перадаючы іх на часовую «апеку» пажылым сваякам, пераканайцеся, што дзядулам і бабулям па сілах справіцца з даручэннем. Не дазваляйце дзецям знаходзіцца паблізу гарачай пліты, ежы, праса, адкрытага агню, полымя свечак, заўсёды хавайце лёгкаўзгаральныя вадкасці.

У дапамогу бацькам — мультфільмы ад ратавальнікаў «Чароўная кніга» і «Спецатрад 112», якія можна адшукаць на афіцыйным канале ведамства на YouTube. Падлеткам рэкамендуецца ўстанавіць мабільны дадатак «Дапамога побач», прагаварыце з імі, чым небяспечныя гульні на будаўнічых пляцоўках, чыгуначных шляхах. І галоўная парада бацькам ад ратавальнікаў — быць станоўчым прыкладам для свайго дзіцяці, ведаць, з кім знаходзіцца вашы дзеці, у што яны гуляюць і з кім сябруюць. Гэтыя простыя рэкамендацыі дазволяць трымаць непаўналетніх пад кантролем, а значыць, пазбегнуць бяды.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота прэс-службы Мінскага абласнога ўпраўлення МНС.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Выдаткі Еўропы на пераадоленне энергетычнага крызісу склалі амаль 800 мільярдаў еўра

Згодна з аналізам цэнтра Bruegel, выдаткі Еўропы на пераадоленне энергетычнага крызісу склалі звыш 792 мільярдаў еўра. Пра гэта паведаміла Reuters. Даследчыкі адзначаюць, што столькі еўрапейскія краіны патрацілі на абарону хатніх гаспадарак і кампаній ад рэзкага росту цэн на энергію. Паводле даных Bruegel, краіны Еўрасаюза з верасня 2021-га і да цяперашняга часу выдаткавалі 681 млрд еўра на пераадоленне энергетычнага крызісу. Вялікабрытанія і Нарвегія, якія не ўваходзяць у ЕС, накіравалі 103 млрд еўра і 8,1 млрд еўра адпаведна. Германія ўзначаліла спіс краін з найбольшымі выдаткамі на пераадоленне энергетычнага крызісу — амаль 270 млрд еўра. Вялікабрытанія, Італія і Францыя наступныя ў гэтым спісе. Выдаткі на барацьбу з энергетычным крызісам цяпер зраўнаваліся з сумай, якая была накіравана ў фонд ЕС для аднаўлення пасля COVID-19 (750 млрд еўра).

### Фармацэўты Швейцарыі заявілі аб дэфіцыце лекаў у краіне

Аб гэтым сказала ў інтэрв'ю газеце Blick прэзідэнт Аб'яднання швейцарскіх фармацэўтаў PharmaSuisse Марціна Руглі, паведаміла TACC. Паводле яе слоў, дэфіцыт закранае ўвесь асартымент. У краіне назіраецца недахоп антыбіётыкаў, якія карыстаюцца вялікім попытам, абязбольвальных, прэпаратаў для сэрца, а таксама сродкаў ад гіпертаніі, хваробы Паркінсона, эпілепсіі і дэпрэсіі. Акрамя таго, існуе дэфіцыт лекаў для лячэння дзяцей. Прэзідэнт PharmaSuisse адзначыла, што «з кожным днём знікае ўсё больш і больш лекаў». Ругі дадала, што з дэфіцытам лекаў сутыкнуліся і іншыя еўрапейскія краіны. Яна растлумачыла, што існуючая сітуацыя ў першую чаргу выклікана тым, што 90 працэнтаў актыўных рэчываў, што ўваходзяць у склад прэпаратаў, паступаюць з Індыі і Кітая, а з-за пандэміі каранавіруса гэтыя краіны пачалі іх экспартаваць у меншай колькасці.

### Запуск міжпланетнай станцыі да Юпітэра намечаны на 13 красавіка

Запуск аўтаматычнай міжпланетнай станцыі JUICE (Jupiter Icy Moons Explorer) плануецца здзейсніць з касмадрома Куру ў Французскай Гвіяне з дапамогай ракеты-носьбіта Ariane 5. Пра гэта паведаміла Еўрапейскае касмічнае агенцтва (ESA). Зонд дасягне Юпітэра ў ліпені 2031 года і будзе знаходзіцца на арбіце планеты, пралятаючы над яе натуральнымі спадарожнікамі. Ён павінен будзе даследаваць так званыя галілеевы спадарожнікі планеты з высокім утрыманнем вадзянога лёду: Ганімед, Еўропу і Каліста, а таксама прастору каля Юпітэра. Асноўная задача — высветліць, ці магло ўзнікнуць жыццё на астранамічных аб'ектах побач з газавымі гігантамі. Як вядома, у Сонечнай сістэме да газавых гігантаў адносяць Юпітэр і Сатурн, гэтыя планеты складаюцца ў асноўным з вадароду і гелію. Акрамя ESA, у стварэнні аўтаматычнай міжпланетнай станцыі масай каля 2,4 тоны бралі ўдзел Нацыянальнае ўпраўленне ЗША па аэранаўтыцы і даследаванні касмічнай прасторы (NASA), а таксама Японскае агенцтва аэракасмічных даследаванняў (JAXA).

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні Пярцову Уладзіміру Барысавічу, міністру інфармацыі, у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь — члены Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі выказваюць глыбокія спачуванні міністру інфармацыі Рэспублікі Беларусь Уладзіміру Барысавічу Пярцову ў сувязі з напаткаўшым яго горам — смерцю МАЦІ.**

# «ГЭТА БЫЎ НАШ АБАВЯЗАК»

**Вялікае і насычанае гістарычнымі падзеямі жыццё пражыў дзевяностагадовы ветэран Афганскай вайны (1979—1989) Віцебскага раёна Іван Аляксеевіч ШАРАЙ. Поўны сілы і жыццёвага аптымізму, ён успамінае свой вайсковы шлях пад дэвізам «Ніхто, акрамя нас!».**

На лёс Івана Аляксеевіча выпалі гады нямецкай акупацыі: у 1941-м яму было дзевяць гадоў. У сям'і, дзе выхоўваліся яшчэ пяць братоў і сясцёр, без бацькі, які пайшоў на фронт, выжывалі цяжка. Ваня быў хваравіты, занадта худы для свайго ўзросту, і ніхто не верыў, што ён зможа стаць на ногі, але ўнутраная сіла дазволіла яму схапіцца за тонкую жыццёвую нітку.

Пасля вайны атрымаў спецыяльнасць мэбельшчыка, працаваў на будаўніцтве Лепельскага льнозавода, а ў 1951 годзе трапіў на тэрміновую службу ў 104-ю гвардзейскую паветрана-дэсантную дывізію і быў накіраваны ў горад Остраў Пскоўскай вобласці. Там Іван Аляксеевіч адпрацоўваў навыкі дэсантнай падрыхтоўкі і канчаткова «захварэў» небам, зрабіўшы сотні крокаў у сінь — выканаў 411 скачкоў з парашутам! Цяпер, праўда, былыя подзвігі даюць аб сабе знаць: найбольш пацярпеў ад стропаў пазваночнік.

З 1963 года лётчык стаў служыць у віцебскай 103-й гвардзейскай паветрана-дэсантнай дывізіі, куды яго запрасілі былы таварыш па службе. Давялося Івану Аляксеевічу ў 1968 годзе ў складзе савецкіх войскаў браць удзел у чэхаславацкіх падзеях. А ў снежні 1979-га аддзяленне старшага прапаршчыка Шарая Абмежаванага кантынгенту савецкіх войскаў было першае паднята па трывозе. Праз некалькі дзён дэсантнікі прызямліліся ў Кабуле. Узялі пад свой кантроль аэрапорт, блакіруючы афганскую авіяцыю, засяродзіліся ў пазначаных раёнах горада, атрымаўшы задачы па блакіраванні асноўных урадавых аб'ектаў.

Старшына батарэі адказваў за харчовую бяспеку сваіх байцоў, бесперабойнае паступленне боепрыпасаў. Неаднойчы даводзілася твар у твар сустракацца са смерцю, бачыць побач забітых таварышаў. Захаваліся ў памяці Івана Шарая «прачэсы» вёсак, дзе панавалі голад і беднасць: малыя дзеці спалі на сене разам з каровамі.

Сярод 50 хлопцаў, якія былі ў батарэі Івана Аляксеевіча, сустракаліся тыя, хто падрываў агульны вайсковы парадак, — прыходзілася перавыхоўваць; былі і тыя, хто звар'яцеў ад убачанага навокал.

Успамінае старшына, як гінулі на вайне не толькі ад варожых куль, але і па асабістай дурасці: чатыры юнакі курылі ў БТРы, забыўшыся на ўсе правілы пажарнай бяспекі. Вакол — порах і гаруча-змазачныя матэрыялы, адно імгненне — і... Застацца ў жывых пашчасціла толькі аднаму. З ім праз некалькі гадоў Іван Аляксеевіч выпадкова сустрэнецца ў Віцебску, не адразу пазнае былога дэсантніка з-за страшных апёкаў на твары...

Амаль тры гады старшына Шарай ваяваў у Афганістане, а дома яго чакала жонка з двума сынамі... «Гэта быў наш інтэрнацыянальны абавязак, і мы як патрыёты, аддаными адной вялікай савецкай дзяржаве, ішлі — па-іншаму нельга было. І калі б сёння мне загадалі стаць на абарону нашай краіны, я, не задумваючыся, падняўся б па загадзе», — дзеліцца Іван Аляксеевіч. На яго кіцелі сярод россыпу медалёў — ордэн Чырвонай Зоркі.

Вярнуўшыся на радзіму ў 1982 годзе, наш герой яшчэ некаторы час служыў у 103-й брыгадзе і, маючы за плячыма 31 год выслугі, быў звольнены ў запас.

Іван Шарай і сёння, на 91-м годзе жыцця, бадзёры духам: ён сам займаецца хатняй гаспадаркай, чытае без акуляраў. Загартаваны арганізм не зачапіла і пандэмія каранавіруса, а значыць, гарачая любоў да жыцця мацнейшая за перашкоды. Іван Аляксеевіч бярэ актыўны ўдзел у сустрэчах з моладдзю, з'яўляецца ўдзельнікам народнага аматарскага аб'яднання ветэранаў вайны ў Афганістане «З болем у сэрцы» — усё гэта захоўвае юнацкі агеньчык у вачах воіна-інтэрнацыяналіста.

Падзеі, якія скончыліся 34 гады назад, штогод 15 лютага паўстаюць у памяці Івана Шарая — асабліва каля помніка ў аграрадарку Акцябрскі. Некалі ветэран стаяў каля вытокаў будаўніцтва гэтага пасёлка, тут і жыве, з'яўляючыся жывой легендай Віцебскага раёна, прыкладам стойкасці і мужнасці для падрастаючага пакалення.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

# ДВОЙЧЫ ПРАЗ АГОНЬ

**Жыхар вёскі Касцюкоўка Гомельскага раёна Уладзімір Данчанка два разы ў сваім жыцці трапіў пад смяротны агонь: першы — калі служыў у Афганістане ў складзе абмежаванага кантынгенту савецкіх войскаў, другі — падчас работы ў 30-кіламетровай зоне Чарнобыльскай АЭС.**

## З гонарам выкананы абавязак

У Дэмакратычную Рэспубліку Афганістан Уладзімір Данчанка адправіўся добраахвотнікам. Малады маёр і не думаў, што яго тут чакае: цяжкае раненне, якое ледзь не каштавала жыцця, і... каханне.

Некалькі гадоў таму Уладзімір Данчанка прыняў удзел у праекце Гомельскага раённага гісторыка-краязнаўчага музея «Час выбраў нас». Дырэктар установы культуры Кацярына Варабей прапанавала воінам-інтэрнацыяналістам прынесці фатаграфіі (падчас службы ў арміі і цяперашнія), падзяліцца ўспамінамі, а таксама пакінуць свой подпіс на падрабязнай карце Афганістана — распісацца насупраць назвы горада ці мясцовасці, дзе ім прыйшлося служыць. Гвардыі падпалкоўнік Савецкай Арміі ў адстаўцы Уладзімір Данчанка распісаўся насупраць слова Кабул.

Нішто з таго, што прыйшлося перажыць, з памяці не згладзілася, але шмат аб чым нельга казаць нават праз гады. Адно афіцэр Уладзімір Данчанка ведае: нашы вайскоўцы праявілі высокі ўзровень ваеннай падрыхтоўкі, згуртаванасць і гераізм.

— Гэтая вайна ў гарачых пясках Афганістана зрывала і выносіла ўсё наноснае і агаляла сапраўдную сутнасць чалавека, — дзеліцца Уладзімір Данчанка. — Тут кожны разумеў, што без падтрымкі таварышаў можа не выжыць, таму словы «воінскае братэрства» прымалі сапраўднае значэнне. І пасля вяртання на Радзіму многія не страцілі сувязь з аднапалчанамі, засталіся сябрамі і пабрацімамі на ўсё жыццё.

Воіны-афганцы неахвотна расказваюць пра баявыя дзеянні, у якіх бралі ўдзел, — настолькі цяжкія гэта для іх успаміны. Куды больш ахвотна яны гавораць аб тым, што набывала тут вялікую каштоўнасць, — сяброўства і каханне.

— Пасля цяжкага ранення і аперацыі ў шпіталі ў Кабуле, калі лекары выратавалі мне жыццё, я трапіў на рэабілітацыю. Тут і сустрэў будучую жонку Таццяну, — кажа Уладзімір Данчанка. — Толькі дзякуючы ёй я падняўся на ног.

У шпіталі Уладзіміру Данчанку ўручылі грамату, падпісаную легендарным камандзірам 108 мотастралковай Невельскай двойчы Чырванасцяжнай дывізіі генерал-маёрам Віктарам Барынькіным. Гэтую ўзнагароду, якую ён атрымаў у жніўні 1987-га, воін-інтэрнацыяналіст бераліва захоўвае і ганарыцца тым, што быў прызнаны адным з найлепшых афіцэраў дывізіі.

— Наш камдыў заўсёды прад'яўляў высокія патрабаванні да асабовага складу, строга сачыў за дысцыплінай і баявой падрыхтоўкай, — успамінае Уладзімір Данчанка. — Можа, таму страты ў нашай 108-й мотастралковай дывізіі былі меншыя, чым у іншых.

У Савецкі Саюз афіцэр Данчанка вярнуўся не адзін — яго суправаджала старшы сяржант медыцынскай службы Таццяна, якая стала сапраўдным анёлам-ахоўнікам. Дарэчы, яны былі не адзіныя, хто сустрэў другую палавінку ў Афганістане. Сёлета ў пары Данчанкі два юбілеі: восенню споўніцца 35 гадоў, як Уладзімір і Таццяна пазнаёміліся ў Кабуле, а 23 лютага дзесяцігоддзе адзначыць іх унучка Даша. «Двое дзяцей падарылі нам пакуль трох унукаў, але мы з Таццянай Іванаўнай спадзяёмся на большае», — усміхаецца Уладзімір Віктаравіч. Дарэчы, сяржант медыцынскай службы на радзіме працягнула стаяць на варце здароўя землякоў — працоўны стаж Таццяны Данчанкі ў сферы аховы здароўя налічвае амаль чатыры дзесяцігоддзі.

## Гарачае дыханне Чарнобыля

Калі адбылася катастрофа на ЧАЭС, Уладзімір Данчанка служыў у Афганістане. Пасля вяртання ў 1988 годзе ён быў назначаны намеснікам камандзіра акруговага батальёна дэгазацыі і дэзакцыі ў ваенным гарадку Аколіца. Літаральна праз месяц ён адправіўся ў раён зоны адчужэння. Служыць у небяспечнай чарнобыльскай зоне таксама падахвоціўся сам.

— Месца на мяжы Хойніцкага і Брагінскага раёнаў, дзе павінна была базіравацца опергрупа, знаходзілася ўсяго за чатыры кіламетры ад маёй роднай вёскі Дуброўнае, — тлумачыць адну з прычын свайго рашэння Уладзімір Данчанка. — Штодня мы выязджалі ў 30-кіламетровую зону і праводзілі дэзактывацыю аб'ектаў, кантралявалі цэласнасць агароджы і выконвалі іншыя дзеянні.

Калі пры чарговым замеры атрыманай дозы радыяцыі высветлілася, што ўзровень персанальнага радыяцыйнага апрамянення дасягнуў граніча дапушчальнай дозы, афіцэр Уладзімір Данчанка пакінуў небяспечную тэрыторыю. Але месяц працы ў непасрэднай блізкасці ад рэактара не прайшоў бясследна: яшчэ зусім маладому чалавеку ўстанавілі артыкул 18 ліквідатара ЧАЭС і групу інваліднасці, звязаную з Чарнобылем...

## Усім нягодам насуперак

Уладзіміру Данчанку прыйшлося кінуць выклік лёсу трэці раз: вакол кіпела мірнае жыццё, і ён проста не меў права застацца на абочыне. Малады чалавек паступіў на юрыдычны факультэт Гомельскага дзяржуніверсітэта імя Францыска Скарыны.

— Я быў самым старэйшым па ўзросце студэнтам дзённага аддзялення ва ўніверсітэце, — з усмешкай успамінае той жыццёвы перыяд Уладзімір Данчанка. — Мяне падганяла адна думка: я сямейны чалавек і павінен забяспечыць сваёй каханай годнае жыццё. Акрамя таго, юрыспрудэнцыя аказалася вельмі цікавай і займальнай навукай: прымушае шмат думаць, аналізаваць і пастаянна развівацца.

Пасля заканчэння ВНУ воін-інтэрнацыяналіст і ліквідатар наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС больш за 20 гадоў працаваў па набытай прафесіі ў розных дзяржструктурах. Падпалкоўнік у адстаўцы ўзначальваў Гомельскую гарадскую арганізацыю Беларускага саюза афіцэраў, быў старшынёй рэвізійнай камісіі абласной арганізацыі саюза. Таму да яго да гэтага часу па параду і юрыдычную дапамогу звяртаюцца ветэраны вайны ў Афганістане і члены іх сем'яў. І ўсім Уладзімір Данчанка дапамагае знайсці выйсце з цяжкай жыццёвай сітуацыі.

**Ірына ГРАМЫКА.**
**Фота Андрэя ФЕАКЦІСТАВА.**

Свой погляд

# ШКОДА, КАЛІ ЎСЁ ГЭТА ПОТЫМ СПАЛЯЦЬ...

**Свой ліст хочацца пачаць з таго, што я расла-расла і дарасла-ткі да Беларускага саюза майстроў народнай творчасці! Потым, у гэтай новай для сябе якасці, пабывала ў розных вёсках нашага і суседніх раёнаў, познаёмілася з іншымі выдатнымі майстрамі і майстрыхамі, палюбавалася іх работамі, аднавіла шэраг ручнікоў, якія дасталіся ў спадчыну. Здавалася б, выключна адны падставы для радасці, але...**

Вось адна сустрэча.

Неяк паехала я ў невялічкую вёску да знатнай вышывальшчыцы. Тая, нягледзячы на ўзрост (80 з добрым хвастом), тупала па дварэ, казала, што з балотца вярнулася — назбірала вядзерца журавін.

Пазнаёміліся мы, пакінулі ягады ў сенцах, пайшлі ў хату. Там — і яшчэ з парога — я ўбачыла шыкоўныя шторы, якія ўпрыгожвалі ўваход у залу.

— Гэта я ў маладосці гладдзю вышывала, — злавіўшы мой позірк, прапела гаспадыня і спрытна падняла тканіну, каб паказаць, колькі ж на ёй васількоў! І непадалёк, на ложку — на посцілцы, на падзоры, на бакавых фіранках і навалках — чырвоных макаў.

Шчодра, вышыўкай ды карункамі, быў аздоблены доўгі ручнік, які «абдымаў» адразу некалькі абразоў на покуці.

Аднак гэта быў толькі пачатак, бо праз кухню мы з гаспадыняй зайшлі ў камору, дзе стаялі два вялізныя акаваныя куфры. «Як сапраўдныя ложкі», — здзівілася я.

— А так і было! — растлумачыла жанчына. — Калі на кірмаш з'язджаліся людзі і заставаліся начаваць, нехта спаў на лавах, а нехта — на куфрах.

Майстрыха тым часам падняла вечка першага і стала даставаць адтуль рэчы. Вось вялікая карціна (заяц скача па чыстым полі — уцякае ад рыжай лісіцы), вось другая — з прыгажуняй на камені ў чаканні прынца...

***— Перш чым вышыць, яе ж трэ было намаляваць. Вы так і рабілі? — пытаю ў жанчыны.***

— Не, я не малявала. Для гладзі мы ўсе тут намочвалі чыстую тканіну, накладвалі яе на чужую гатовую вышыўку і пераздымалі. Хімічны аловак мог нешта прапусціць, не даматываць, — тады ўжо прыдумвалі самі, падбіралі іншыя колеры.

***— А калі ж быў час усім гэтым займацца, вышываць? У вас жа работа, сям'я, гаспадарка...***

— Я заўсёды ўставала раненька, — успамінала жанчына. — У печы падпалю, карову падаю — пакуль у поле выганяць, глядзіш, трохі павышываю. На гэты занятак увесь мой вольны час ішоў, кожная хвілінка.

***— А якое тады асвятленне было?***

— Летам добрае, дзённае, бо позна цямнее... Зімой — вышывалі пры лучыне, потым — пры газавай лямпе, а з'явілася электрычнасць, дык і зусім добра стала! Можна крыжыкам вышываць. Ён жа памылак не даруе: недзе празяваў, — распорвай і пачынай спачатку.

Расказваючы аб ранейшым, гаспадыня ўсё даставала і даставала з куфра свае работы, а я не магла на іх налюбавацца!.. Цікавыя малюнкі, яркія фарбы на бялюткім мяккім палатне. Запыталася, як можна яго вось так адбяліць?

— А гэта не я рабіла. Гэта ўсё раса дый вада. Яны лён адбельвалі, — дзялілася майстрыха. — Я хіба расцілала палотны ды варочала з боку на бок... А парклаць засыпала попелам, залівала вадой — ды на вогнішча ў вялікім посудзе. Раней спецыяльна жлукты былі. Каб лішнюю ваду не цягаць, проста адкрывалі адтуліну. Шмат працавалі. Некалі кожная дзяўчына сама пасаг пачынала збіраць. Хлопцы на вячорках толькі прыглядаліся, хто што ўмее, ці спрытна робіць. Так выбіралі нявесту. Ад велічыні пасагу шмат што залежала.

***— Вашы ручкі, мусіць, дужа цаніліся?***

— Так-так... Мой муж Мікалай, светлай памяці, нават розную жаночую работу рабіў, каб я вышывала. Але ж гэта — некалі, а цяпер... — жанчына цяжка ўздыхнула. — Цяпер, дзіцятка, іншая мода. Мае дзеці па гарадах жывуць, ім такое не трэба. А ўнукі, дык і зусім... Яны мае вышыванкі анучамі завуць... Шкода будзе, калі потым, пасля мяне, іх проста спаляць.

...Успамінаючы тую сустрэчу, майстрыху і яе паўнюткія куфры, думаю, колькі ж іх па нашых вясковых хатах, колькі цікавых работ чакае сваёй, мо таксама трагічнай, долі?

А можа, нашчадкі ўсё ж пашкадуюць рукатворную гісторыю і аддадуць яе не агню — занясуць у дамы народнай творчасці, у бібліятэкі, школы, музеі, каб такім чынам захаваць памяць?

**Валянціна Нікіціна,**

*г. Клічаў.*

След на зямлі

# «ДЛЯ МЯНЕ ЁН НЕ ПРОСТА СЯБРА...»

**Успомнім мы — успомняць, магчыма, нас. У сёлетнім лютым выдатнаму беларускаму журналісту Васілю Рошчыну споўнілася б 70.**

**Мы пазнаёміліся ў 1978-м, калі я ўжо трэці год шчыраваў у «Сельской газете», а ён, яшчэ студэнт, здзіўляў сваім майстэрствам чытачоў «Звязды». «Таленавіта, злабадзённа, дакладна», — казалі пра яго публікацыі «звяздоўскія» «зубры» Анатоль Мяснікоў, Уладзімір Гойтан, Вячаслаў Вольскі, Леанід Сузін. І як было не пагадзіцца, калі Васіль і сапраўды першы адгукаўся на людскія праблемы: ехаў, разбіраўся, спачуваў, знаходзіў выйсце.**

Родам ён быў з Правідзінца, маленькай касцюковіцкай вёскі. Свае першыя веды набываў у Саматэвіцкай сярэдняй школе, тамсама, дзе і два народныя пісьменнікі Беларусі — Аркадзь Куляшоў і Іван Чыгрынаў. Васіль шчыра ганарыўся сваім сяброўствам з Іванам Гаўрылавічам, разам з ім часта ездзіў на малую радзіму, радаваўся выхаду ў свет раманаў «Апраўданне крыві», «Свае і чужынцы»...

Дарэчы, правобразам адной з гераінь згаданых твораў стала родная маці журналіста Вольга Васілеўна, якая шмат расказвала пісьменніку пра нялёгкія выпрабаванні, што выпалі на долю аднавяскоўцаў у гады вайны... Яна ўмела прымаць гасцей, умела частаваць, перамогшы інсульт, з цеплынёй расказвала, якім добрым лекарам стаў для яе агульны любімец — сіямскі кот.

Некалькі гадоў гэтая разумная і надзвычай паважлівая да людзей жанчына пражыла ў Васіля, у чатырохпакаёўцы на Пуліхава, 29, куды сям'я перасялілася пасля таго, як былы адказны сакратар «Звязды» пачаў працаваць у «Социалистической индустрии», а пасля — «Рабочей трибуне». З усіх уласных карэспандэнтаў саюзных газет («Правда», «Известия», «Труд», «Аргументы и факты», «Культура»...) па Беларусі Васіль Рошчын быў самы малады, але прытым — не менш аўтарытэтны. Дзеля справы і сяброў ён быў гатовы на многае.

Помню, я доўгі час не мог заняцца рукапісам гамяльчаніна Івана Сечкі, якога несправядліва асудзілі за выпадковы пераход беларуска-польскай граніцы. Ён 16 гадоў правёў у лагерах, а ў мяне бракавала цярпення, каб паглыбіцца ў тэкст, дасланы на шматлікіх паперках...

Помню, «прагледзець» іх папрасіў Васіля і праз тры дні атрымаў... гатовы да друку нарыс «Узник Норильлага» за... маім подпісам.

Яшчэ тры дні давялося ўгаворваць сапраўднага аўтара, каб ён паставіў свой. Сышліся на кампрамісе: артыкул выйшаў за двума і заняў цэлую старонку (вялікага фармату) ў «Сельской газете».

Гэта — аб тым, наколькі бескарыслівы быў Васіль, наколькі незайздрослівы да чужых знаходак і поспехаў. А вось яму — зайздросцілі. Яшчэ і як!

...За сваё кароткае жыццё (44 гады!) Васіль Рошчын паспеў заявіць пра сябе як паэт, падтрымаць сваім высокім майстэрствам многія рэспубліканскія выданні, многіх маладых калег. Для мяне ён быў не проста сябрам: я лічыў яго сваім братам, без якога ў свой час не ўяўляў ні сваё жыццё, ні сваю творчасць.

**Уладзімір Барысенка.**

*г. Мінск.*

Рэзананс

# Дзеці часам не разумеюць, што блізкаму чалавеку цяжка

**У любімай газеце шмат цікавых артыкулаў, цікавых старонак: «Што людзі пішуць» — гэта пра жыццё, пра нашу сапраўднасць.**

**У нумары за першага лютага зачапіў, што называецца, ліст Соф'і Кусянковай «Мусіць, нешта ўпускаем мы ў выхаванні дзяцей?» Мне здалося, я ведаю, што. У бацькоў цяпер — адно-два дзіцяткі, у бабуль і дзядуляў — па два-тры ўнукі. Ну як пры гэтым не лічыць іх выключнымі? Як не трэсціся, не песціць, не апекаваць, не шкадаваць... І тым самым не падсаджваць сабе на шыю?**

Трэба сказаць, што садзяцца яны паступова, памалу, а вось сядзець там прывыкаюць хутка. І тады ўжо не скінеш, каб і хацеў: «дзіця» прыстасавалася, яно не разумее, што блізкаму чалавеку можа быць цяжка.

Свежы прыклад. Не так даўно выклікаў я з Полацка двух сыноў, каб дапамаглі спарадкаваць прывезеныя з лясніцтва дровы: іх сем кубоў было — непарэзаных, скінутых, можна сказаць, за плотам — далекавата.

На падмогу старэйшы сын узяў свайго сына, і працэс пайшоў. Я ўзяўся пілаваць бярвёны, «госці» — адвозіць у двор і складаць... Тачку цягаць сын даручыў... малому.

Я спачатку запярэчыў: маўляў, 10 гадкоў... Не цяжкавата будзе?

На што сын адказаў пытаннем: «А табе ў такім узросце было лягчэй?» (Я толькі глянуў: «Ну вядома ж, не і яшчэ раз не!»)... Так што хай павозіць, а мы — пагрузім-разгрузім».

Мы дружна, добра папрацавалі! Потым разам пасядзелі за сталом, пачаставаліся смачнымі калдунамі, пагаварылі, і нарэшце, нешта ўзяўшы з сабой, мае госці з'ехалі.

...Нам з жонкай прыемна ўспамінаць гэты дзень. Хлопцам, спадзяёмся, таксама, бо яны зрабілі добрую справу: папрацавалі, дапамаглі старэйшым.

Радасць ад гэтага дзеці павінны адчуваць змалку, шкадаваць найбольш сваіх родных. І толькі пасля ўжо — коцікаў ды сабачак.

**Аляксандр Матошка,**

*Расонскі раён.*

Што бачу

# Было наша, стала ваша, але ж не чужое... Не!

**...Людміла любіла свой дом у вёсцы: тут яна нарадзілася, вырасла, сюды — разам з мужам — шмат гадоў прыязджалі на выхадныя: дыхалі свежым паветрам, глядзелі маці, садзілі агарод.**

Раніцай яна выйшла, каб сабраць там апошнія кабачкі, і затрымалася: непадалёк, па закінутым падворку цёткі Тоні, хадзілі нейкія незнаёмцы. «Хто ж такія?» — устрывожылася кабета, падышла бліжэй і, здаецца, прызнала сына нябожчыцы-гаспадыні, яе нявестку.

— Добры дзень вам! — павіталася першай. — Вова?

— Добры-добры, Люда! — узрадаваўся мужчына. — Але ж я не Вова, а — Саша... Толькі ты не зважай: нас з братам многія блытаюць.

— Падобныя, — згадзілася Людміла. — Ды і не прыязджалі даўно, а тут... Нейкая патрэба?

— Ат, не пытайся, — зірнуўшы жонцы ў акуляры, сумеўся мужчына. — Ты ж, можа, ведаеш, чула?

Людміла, ну зразумела ж, ведала, што ў Сашавых бацькоў — два сыны і дачка, што ўсе яны адукаваныя, паспяховыя і цяпер гарадскія, што хату родную (у вёсцы здаўна казалі) збываць не збіраюцца... Аж тут на табе — як быццам прадаюць...

— Але ж нічога, нічога страшнага, — падбадзёрыла суседа Людміла. — Не вы першыя...

Хацела яшчэ нешта дадаць...

— Прабач, — хаваючы вочы, перапыніў сусед, — мы вельмі спяшаемся. Вася Раманаў у Мінску хварэе. Прасіў, калі будзем у вёсцы, хату яго паздымаць.

— Дык яе ж прадалі? — не зразумела Людміла.

— Ну і што?.. Яна ж пасля гэтага чужой не стала? Хоць на «фотцы», а ўбачыць добра, — з разуменнем заявіў сусед. І ўжо сыходзячы, пахваліў:

— А вы малайцы! Прыгожа дом свой зрабілі.

...На гэтым суседзі развіталіся: магчыма, назаўжды.

**Ірына Войтка,**

*г. Слонім.*

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 311-17-36.

Здаровая ўсмешка

# 32 — І ЎСЕ СВАЕ

## Беларусы сталі часцей клапаціцца пра здароўе зубоў

**За мінулы год да ўрачоў-стаматолагаў мінчане звярталіся каля 13 мільёнаў разоў. Пры гэтым 90 % наведванняў прыпадае на долю дзяржаўных клінік, 10 % — на прыватныя кампаніі. Аднак колькасць апошніх паступова расце. Каля 22 % наведванняў звязана з прафілактычным аглядам. І гэта сведчыць аб тым, што беларусы сталі больш увагі аддаваць свайму здароўю, у тым ліку і здаровай усмешцы.**

### Тэхналогіі аднолькавыя, розніца ў цане істотная

Як паведаміў **галоўны ўрач 8-й гарадской клінічнай стаматалагічнай паліклінікі Мінска Андрэй ЕСЬМАН,** летась сумесна з супрацоўнікамі стаматалагічнага факультэта БДМУ былі грунтоўна перагледжаны клінічныя пратаколы. Працаваць па іх артаподы і артадонты пачнуць ужо з 1 сакавіка гэтага года. Дапрацоўваюцца клінічныя пратаколы па аказанні дапамогі ў хірургічнай, тэрапеўтычнай і дзіцячай стаматалогіі.

Спецыяліст адзначыў, што летась не толькі ў дзяржаўных, але і прыватных клініках прайшоў шэраг маніторынгаў і праверак. У прыватных стаматалагічных цэнтрах выяўлены сістэмныя парушэнні ў галіне санэпідрэжыму, выкарыстанне медыцынскай тэхнікі без тэхнічнага абслугоўвання, вядзенне пярвічнай медыцынскай дакументацыі неналежным чынам.

— Каб абараніць правы пацыента, мусіць быць забяспечана пярвічная медыцынская дакументацыя. Гэта пытанне будзе на кантролі. Разам з тым хачу адзначыць, што кіраўнікі прыватных кампаній аператыўна рэагуюць і ліквідуюць выяўленыя недахопы, — адзначыў Андрэй Есьман.

Сістэма аховы здароўя, у тым ліку і матэрыяльна-тэхнічны складнік, добра фінансуецца. Стаматалагічныя клінікі і кабінеты забяспечаны новым сучасным абсталяваннем: толькі ў 2022 годзе для сталічных паліклінік было закуплена 20 стаматалагічных установак. Урачы забяспечаны сродкамі індывідуальнай аховы і расходнымі стаматалагічнымі матэрыяламі. Увядзенне санкцый на забяспечанасць матэрыяламі і прэпаратамі не паўплывала.

Па экспарце медыцынскіх паслуг у стаматалогіі імкнуцца выйсці на дапандэмічны ўзровень. Летась толькі стаматалагічныя паліклінікі Мінска (без уліку стаматалагічных кабінетаў пры паліклініках і бальніцах) зарабілі каля 300 тысяч долараў.

— Наша ўстанова ў 2019 годзе зарабіла 113 тысяч долараў на экспарце паслуг, у 2020-м за першы квартал — каля 22 тысяч долараў, а вось далей значна праселі, — адзначыў галоўны ўрач. — Сёння экспарт паслуг аднаўляецца, бо беларуская медыцына — гэта якасць, даступнасць, брэнд.

Андрэй Есьман расказаў, што многія клінікі арандуюць жыллё для сваіх замежных пацыентаў, у тым ліку заключаюць дагаворы з гасцініцамі. Пацыенты дасылаюць на электронную пошту свае здымкі, і спецыялісты складаюць папярэдні план лячэння, колькасць наведванняў, тэрміны і арыенціровачную суму. Такім чынам, пацыент усведамляе, колькі разоў яму варта з'ездзіць, на які перыяд і на якую суму. Пры гэтым у Беларусі маюцца ўсе сучасныя тэхналогіі, абсталяванне і матэрыялы, а розніца ў цане істотная.

### Пры навуковай падтрымцы

Усе 14 кафедраў стаматалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта вядуць навукова-даследчую работу. У першую чаргу гэта практыка-арыентаваныя тэхналогіі, якія выкарыстоўваюць на прыёме ўрачы-стаматолагі, адзначае **дэкан стаматалагічнага факультэта БДМУ кандыдат медыцынскіх навук Таццяна ШЭВЕЛА.** Прапанаваныя навуковыя распрацоўкі зацверджаны Міністэрствам аховы здароўя ў выглядзе інструкцый па прымяненні.

У прыватнасці, кафедра хірургічнай стаматалогіі займаецца навуковай праблемай перыімплантыту — запалення косці ў вобласці ўстаноўленага дэнтальнага імплантата.

— Даказана, што адна з прычын запалення ў коснай тканцы — захворванне страўніка-кішачнага тракту, а менавіта прысутнасць бактэрыі хелікабактар пілары. І ў інструкцыі па прымяненні выкладзены падрабязны алгарытм дыягностыкі, калі перад тым, як правесці аперацыю па дэнтальнай імплантацыі, пацыенту неабходна прайсці абследаванне на прысутнасць гэтай бактэрыі, — расказвае Таццяна Шэвела.

Даследуецца і праблема рэабілітацыі пацыентаў з паталогіяй сківічна-тварнай вобласці з выкарыстаннем рэфлексатэрапіі. Гэты метад адрозніваецца тым, што не мае пабочных эфектаў і спрыяльна ўздзейнічае на ўвесь арганізм.

Максімальна захаваць зубы дапамагаюць навуковыя распрацоўкі кафедры эндадантыі. Яны займаюцца праблемай лячэння каранёвых каналаў зубоў і іх пералечваннем пры няякасным пламбіраванні.

Лячэннем перыадантыту і сучаснымі спосабамі выяўлення перыадантапатагенных мікраарганізмаў займаецца кафедра перыадантталогіі. Сёння распрацаваны адпаведныя экспрэс-тэсты, і пацыенту аператыўна падчас стаматалагічнага прыёму ўстанаўліваюць прычыну развіцця перыадантыту.

Што датычыцца імпартазамяшчэння, то супрацоўнікі некалькіх кафедраў, у прыватнасці кафедры агульнай стаматалогіі і артапедычнай стаматалогіі, распрацоўваюць сучасныя беларускія стаматалагічныя матэрыялы і дэнтальныя імплантаты.

— Нашы загадчыкі кафедраў, дацэнты, прафесары адкрыты для пацыентаў. Ва ўніверсітэце функцыяную прафесарска-кансультатыўны цэнтр, які прымае ўсіх ахвотных на базе 5-й сталічнай паліклінікі на вуліцы Ясеніна.

### Анлайн-кансультацыя?.. Магчыма

Сёння анлайн усё больш уваходзіць у наша жыццё, у тым ліку кансультаванне з урачом такім спосабам. Але ці магчыма гэта ў стаматалогіі?

— Якая практычная карысць ад анлайн-кансультацыі? Калі пацыент толькі заходзіць у кабінет, па паходцы я бачу, ці ёсць праблемы. Напрыклад, парушэнні апорна-рухальнага апарату, пазваночніка, паставы ў першую чаргу сведчаць пра тое, што могуць быць праблемы са скронева-ніжнясківічным суставам, — кажа Таццяна Шэвела. — Калі ўрач аглядае знешні выгляд, скурныя пакровы, стан слізістай губ, ён можа сказаць, ці дастаткова ў арганізме пацыента мікраэлементаў і вітамінаў... Таму, вядома, лепш наведаць спецыяліста асабіста. Але, безумоўна, пэўныя пытанні можна задаць. Калі гэта ў кампетэнцыі стаматолага — і не нашкодзіць, урач пастараецца адказаць.

### Чаму стаматолагу важна ведаць пра перанесены ковід

Калі пацыент прыходзіць да стаматолага, ён абавязкова мусіць сказаць, што нядаўна перанёс каранавірусную інфекцыю.

— Пры лячэнні прымяняюцца прэпараты, якія ўплываюць на ўласцівасці крыві, а менавіта на яе згусальнасць. І калі пацыент прымае ксарэлту, ён мусіць пра гэта сказаць. Прычым не толькі хірургу-стаматолагу, бо пры выдаленні зуба магчыма развіццё крывацёку, але і ўрачу-тэрапеўту, бо пры анестэзіі ін'екцыя можа выклікаць масіўную сківічна-тварную гематому, — тлумачыць Таццяна Шэвела. — Акрамя таго, прызначэнне супрацьвірусных прэпаратаў уплывае на стан слізістых поласці рота. І пацыентам, якія перанеслі ковід, праз нейкі час не пашкодзіць звярнуцца для прафілактычнага агляду да ўрача-стаматолага.

### Беражы змоладу! Не толькі гонар

Увогуле ж, прафілактыка, калі справа датычыцца здаровых зубоў і прыгожай усмешкі, важная з самага дзяцінства. У Беларусі не першае дзесяцігоддзе дзейнічаюць разнастайныя прафілактычныя праграмы для дзяцей. Яны адпавядаюць міжнароднаму ўзроўню і ўсім патрабаванням Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. Адна з іх прадугледжвала навучанне дзяцей з першага класа правільнай чыстцы зубоў у школе. І яна дала вынікі, якія ўражваюць: захваральнасць на карыес знізілася на 36 %, прыводзіць статыстыку **загадчык дзіцячага стаматалагічнага аддзялення 22-й гарадской дзіцячай паліклінікі Мінска Людміла ЖУГІНА.**

Яна адзначыла, што ўсе дзеці пачынаючы з аднагадовага ўзросту мусяць штогод наведваць стаматолага з прафілактычнымі мэтамі. Менавіта такія візіты дазволяць вырашыць праблемы на ранняй стадыі і захаваць зубы.

У складаных выпадках дзяцей у сталіцы накіроўваюць у Мінскі гарадскі дзіцячы клінічны цэнтр па стаматалогіі. Ён нядаўна адкрыты пасля рэканструкцыі, і дзіцячыя стаматолагі аказваюць усебаковую высокапрафесійную дапамогу.

Карысна ведаць

# У вачах мігціць

## Што такое візуальны шум і як з ім змагацца?

**Візуальны шум — праблема нават тых кватэр, дзе быццам бы ўсё ў парадку. Чысціня падтрымліваецца, здаецца, што ўсё на сваіх месцах. І, тым не менш, увесь час узнікае адчуванне, што вакол гармідар, колькі б сіл на прыборку не аддаў. Калі гэта вам знаёма, хутчэй за ўсё, віной тут той самы візуальны шум.**

Візуальным смеццем (або візуальным шумам) называюць вялікую колькасць прадметаў інтэр'ера або дызайну, з-за якіх абстаноўка здаецца негарманічнай, а яе выкарыстанне — нефункцыянальным.

— Лішак глядзельнай інфармацыі расфакусіроўвае ўвагу і перашкаджае сканцэнтравацца на чымсьці адным. Часта мы гэтага нават не заўважаем. Аднак відавочна, што навакольныя аб'екты адцягваюць значную долю нашай увагі, — кажа **Алена СМІРНОВА, урач-гігіеніст Мінскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя.**

Самымі распаўсюджанымі крыніцамі візуальнага шуму з'яўляюцца:

- сувеніры (магніты на халадзільніку, статуэткі і г. д.);
- разнамасны каляровы дэкор;
- каляровыя шпалеры і плітка;
- рознакаляровыя кухонныя рэчы;
- яркая ўпакоўка прадуктаў, бытавой хіміі.

### Як гэта ўплывае на наш арганізм?

Нам цяжка засяродзіцца на нечым канкрэтным: усё адцягвае ўвагу, складаней рабіць сур'ёзныя справы, якія патрабуюць максімальнай увагі, вучыцца. Такі стан цалкам здольны прывесці да павышанай раздражняльнасці. Яшчэ адзін значны факт: у сувязі з пераўзбуджэннем, выкліканым такім перагружаным асяроддзем, у чалавека ўзнікаюць цяжкасці з засынаннем. Становіцца больш складана ўспрымаць новую інфармацыю, што асабліва адбіваецца на студэнтах і школьніках. Менавіта таму так важна, каб у пакоі ў падлетка была гармонія.

### Зменшыць? Можна

1. Пазбаўцеся ад непатрэбных сувеніраў і іншых рэчаў. Правіла простае: калі вы не карыстаецеся рэччу больш за год, яна не нясе станоўчых эмоцый і не радуе вас, значыць, яна не патрэбна. Па сутнасці, неабходна правесці расхламленне.

2. У зоне бачнасці і на адкрытых паверхнях неабходна пакінуць толькі тое, чым вы актыўна карыстаецеся. Яркія прадметы, з якімі вы не можаце расстацца, можна змясціць у непразрыстыя шафы.

3. У дызайне інтэр'ера выбірайце аднатонны дэкор без дробных дэталяў і ўзораў.

4. Шампуні, сродкі для мыцця посуду, крупы і іншае, што звычайна захоўваецца ў яркіх упакоўках, закліканых прыцягнуць увагу ў краме, можна перамясціць у слоічкі і бутэлечкі простай формы.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
15 лютага 2023 г. № 6 (692)
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

САЦЫЯЛЬНЫ КЛОПАТ

# КОЛЕР ДАСТАЎКІ — СІНІ

## Выкананне патрабаванняў дзяржаўнага сацыяльнага стандарту па дастаўцы пошты — пад пільным кантролем мясцовай улады

**Такое хвалюючае для жыхароў глыбінкі пытанне, як закрыццё аддзялення паштовай сувязі з-за аптымізацыі, яшчэ некалькі гадоў таму ўскалыхнула і прымусіла перажываць вяскоўцаў многіх сельскіх населеных пунктаў па ўсёй краіне. Вядома, у вёсках, дзе з грамадскіх аб'ектаў часта толькі крама, пошта — фарпост сацыяльнага жыцця. У новых умовах, без стацыянарных аддзяленняў сувязі, актыўная работа пошты на вёсцы працягваецца. І гэта жывы працэс, якія развіваецца і ўдасканальваецца. Карэспандэнт «Звязды» разам з паштальёнам мотадастаўкі адправілася ў рэйс па Калінкавіцкім раёне Гомельшчыны.**

### Паштальёна выклікалі?

Паштальён па суправаджэнні і абмене пошты Калінкавіцкага рэгіянальнага вузла паштовай сувязі Наталля Бурлакова на маршруце два гады. Яна — мабільны паштальён, разам з кіроўцам Васілём Туроўчыкам штодзень аб'язджае замацаваны ўчастак матарызаванай паштовай дастаўкі. Нягледзячы на новы фармат работы, у яе як спецыяліста, што працуе ў вёсцы, па-ранейшаму вельмі важная сацыяльная місія, гаворыць Наталля.

— Тут трэба быць яшчэ і псіхолагам, бо людзі чакаюць не толькі газет і тавараў, але і ўвагі. Хочуць пагаварыць. Таму вельмі ўважліва слухаю, якія паслугі пошты патрэбныя чалавеку, бяру заказы, але заўсёды памятаю пра час на маршруце.

— Міхнавічы, Клінск, Рудня-Гарбавіцкая, Рудня-Антонаўская, Якімавічы, Садкі — населеныя пункты на маім маршруце, — расказвае Наталля.

Усяго ў яе як у паштальёна па суправаджэнні і абмене пошты зона адказнасці — каля двухсот адрасатаў.

### Ад цукру да цэменту

Экіпаж на машыне з пазнавальнай паштовай афарбоўкай якраз уязджае на тэрыторыю буйной, але аддаленай вёскі Міхнавічы, што амаль за 20 кіламетраў ад Калінкавіч. У вёсцы экіпаж мотадастаўкі развозіць па спецыяльных скрынях карэспандэнцыю для адрасатаў, а паралельна дастаўляе дадому раней заказаныя вяскоўцамі тавары.

*(Заканчэнне на 9-й стар.)*

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

## Міжнародны напрамак, новая партыя і сацыяльна-эканамічныя прыярытэты

● Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна Рунец і старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей Сівец, якія з'яўляюцца членамі рабочай групы Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па супрацоўніцтве з Парламентам Рэспублікі Казахстан, узялі ўдзел у сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Казахстана ў Беларусі Аскарам Бейсенбаевым. Бакі абмеркавалі перспектывы развіцця беларуска-казахстанскіх адносін, у тым ліку міжпарламенцкага супрацоўніцтва. Акрамя таго, удзельнікі сустрэчы абмяняліся думкамі па актуальных пытаннях рэгіянальнага парадку дня і ўзаемадзеяння ў міжнародных арганізацыях.

● Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл Русы, Сяргей Сівец і Алег Раманаў узялі ўдзел у пасяджэнні арганізацыйнага камітэта па стварэнні Беларускай партыі «Белая Русь», якое адбылося ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. У склад аргкамітэта ўвайшлі прадстаўнікі грамадзянскай супольнасці, кіраўнікі найбуйнейшых грамадскіх аб'яднанняў. Як адзначыў старшыня рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» Алег Раманаў, гэтая партыя будуецца з нуля. «Мы не пераўтвараем грамадскае аб'яднанне «Белая Русь», яно застаецца ў палітычнай і грамадскай прасторы краіны, — звярнуў увагу парламентарый. — Новая партыя — гэта самастойная сіла, якая накіравана на вырашэнне тых вострых праблем, якія стаяць і перад грамадствам, і ў цэлым у свеце. Калі казаць аб прычынах таго, чаму мы падышлі да стварэння палітычнай партыі, — іх некалькі. Па-першае, сталасць грамадзянскай супольнасці нашай краіны. Людзі адчулі неабходнасць актыўнага ўдзелу ў палітычным жыцці, хочуць самі тварыць сваю будучыню, будучыню краіны, сваіх дзяцей. Па-другое, мы разумеем, што патрэбныя суб'екты для адказу на тыя жорсткія выклікі, якія кінуты нашай краіне. Мы бачым, што ў свеце ідзе вайна. І для таго каб Беларусь была востравам стабільнасці, росквіту і поспеху, мы павінны прыкладаць вельмі сур'ёзныя намаганні, патрэбны арганізаваныя сілы. Нашая партыя будзе адной з такіх сіл, якая зможа генерыраваць адказы на тыя выклікі, якія неабходна вырашаць у нашай краіне». На пасяджэнні абралі старшыню аргкамітэта. Ім стаў старшыня рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» Алег Раманаў. Устаноўчы з'езд Беларускай партыі «Белая Русь» адбудзецца 18 сакавіка і пройдзе на базе канцэртнай залы «Мінск».

● Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ірына Старавойтава наведала сацыяльныя аб'екты г. Оршы і Аршанскага раёна Віцебскай вобласці. Падчас візіту былі комплексна разгледжаны пытанні функцыянавання Фізкультурна-аздараўленчага комплексу аграгарадка Бабінічы, Антонаўскага сельскага Дома культуры, Бабініцкай сельскай бібліятэкі-клуба, Бабініцкай сярэдняй школы Аршанскага раёна і Ваенна-гістарычнага музея імя Героя Савецкага Саюза К. С. Заслонава. Ірына Старавойтава азнаёмілася з матэрыяльна-тэхнічнай базай дадзеных арганізацый і прапановамі па ўдасканаленні іх дзейнасці. Акцэнт быў зроблены на якасці аказання сацыяльных паслуг насельніцтву, умовах працы работнікаў ва ўстановах культуры і спорту, эфектыўнасці ажыццяўлення адукацыйнага працэсу і патрыятычнага выхавання, арганізацыі харчавання ва ўстановах адукацыі. Падчас сустрэчы з жыхарамі аграгарадка Бабінічы і вёскі Антонаўка Аршанскага раёна парламентарый уважліва выслухала мясцовых жыхароў, якія расказалі аб сваіх праблемах, просьбах і пажаданнях.

**Вераніка КАНЮТА.**

# ВІНШАВАННІ СА ЗНАКАВАЙ ДАТАЙ

**Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Валерый БЕЛЬСКІ ўзяў удзел у святочных мерапрыемствах, прысвечаных 85-годдзю ўтварэння Гомельскай вобласці. Віцэ-спікер Савета Рэспублікі ўручыў узнагароды жыхарам Гомельшчыны, якія ўнеслі важкі ўклад у развіццё рэгіёна.**

На ўрачыстым сходзе ў гонар юбілею вобласці Валерый Бельскі звярнуўся да жыхароў Гомельшчыны і зачытаў прывітальны адрас Старшыні Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай.

«Гомельшчына багатая на прыродныя, эканамічныя і інтэлектуальныя рэсурсы. Кожны яе куток беражліва захоўвае своеасаблівасць гісторыі, традыцый, духоўнай і матэрыяльнай культуры. Але самы галоўны здабытак Прыпяцкага Палесся — гэта яго жыхары, працавітыя, таленавітыя, шчодрыя людзі — сапраўдныя гаспадары сваёй зямлі», — ад імя Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі і сябе асабіста адзначыла Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава.

Гомельская вобласць — адзін з прамысловых флагманаў краіны. Тут засяроджана шмат значных не толькі для Беларусі, але і для ўсёй еўразійскай прасторы прадпрыемстваў, падкрэсліў у размове з журналістамі госць святочных мерапрыемстваў на Гомельшчыне, намеснік Старшыні Савета Рэспублікі Валерый Бельскі.

— Я ўпэўнены, што 85-годдзе Гомельшчыны стане новай вяхой развіцця рэгіёна і пунктам адліку ў лепшую будучыню, — адзначыў віцэ-спікер Савета Рэспублікі і падкрэсліў высокі патэнцыял паўднёва-ўсходняга рэгіёна. — Тут жывуць выдатныя людзі, якія сутыкнуліся са шматлікімі бедамі за сваю гісторыю. На жаль, на эканамічны патэнцыял рэгіёна да гэтага часу ўплывае трагедыя на Чарнобыльскай АЭС. Але дзякуючы мэтанакіраванай падтрымцы дзяржавы, мужнасці гамяльчан гэтыя праблемы пераадольваюцца.

На ўрачыстым сходзе ў гонар юбілею вобласці Валерый Бельскі ўручыў ганаровыя ўзнагароды Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі. За важкі асабісты ўклад у патрыятычнае і духоўна-маральнае выхаванне грамадзян падзякай Старшыні Савета Рэспублікі былі адзначаны старшыня Гомельскага абласнога аддзялення ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі» Уладзімір Гаўрыловіч і старшыня Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага прафесійнага саюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму Міхаіл Жукевіч. Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу ўзнагароджана дырэктар Жлобінскага гісторыка-краязнаўчага музея Ніна Шрэйтэр.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

НА ПРЫЁМ ДА СЕНАТАРА

# ПЕНСІЯ, РАМОНТ, ІНВЕСТЫЦЫІ

## Набалелыя пытанні жыхароў да Таццяны Рунец

**Імкнучыся вырашыць свае праблемы, людзі прыходзяць на асабісты прыём да сенатара, каб знайсці вырашэнне пытання, з якім не ў адны дзверы ўжо грукалі да гэтага. Некаторыя звяртаюцца не ўпершыню, і Таццяна РУНЕЦ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах, ужо ведае іх, а хтосьці прыходзіць са словамі «я пра вас чытала, і веру, што вы можаце дапамагчы». Гэтым разам у Савеце Рэспублікі на прыёме ў сенатара ўзнялі самыя розныя пытанні: ад налічэння пенсіі да просьбы дапамагчы знайсці 12 мільёнаў долараў на адкрыццё прадпрыемства.**

### 42 «ЧАРНОБЫЛЬСКІЯ» РУБЛІ

90-гадовы Алег Хруцкі, напрыклад, з тых, хто прывык адстойваць свае правы, і ўжо сустракаўся з сенатарам у верасні мінулага года. Тады ён прасіў паклапаціцца пра бамжа, якога пакрыўдзіў лёс, скардзіўся на дрэнна выкананы рамонт пад'езда і прасіў прызначыць сабе пенсію як ліквідатару аварыі на ЧАЭС. На ўсіх скаргах тады далі адказы. Бамжа так і не знайшлі: сам ён у бальніцу не звяртаўся і аднаўляць дакументы не прасіў. Адносна капрамонту прыходзілі да Алега Хруцкага з адміністрацыі раёна, аднак ён лічыць за лепшае вырашаць пытанне з сенатарам.

— *Пафарбавалі пад'езд няякасна, зрабілі зашмат, каб узяць больш грошай, і каштарыс вісеў незацверджаны на сцяне. Пасля тынкоўка стала адвальвацца, а да мяне госці прыходзяць, дык аж сорамна, — скардзіцца пенсіянер. — Акт аб выкананых работах прыйшлі падпісваць да жыхароў ненадзейных, і самі работнікі без вопыту яго рабілі, пэўна, што так дрэнна.*

Жыхар настолькі пакрыўджаны, што прапануе скасаваць Міністэрства ЖКГ, каб усімі пытаннямі па будынках займалася Мінбудархітэктуры. Між тым недахопы ў рамонце ужо разоў пяць папраўлялі па гарантыйных абавязках, паведаміў **старшыня адміністрацыі Цэнтральнага раёна Мікалай ПАЛЯКОЎ.**

— *Напрыканцы снежня мінулага года ўнесены змены ў закон, якія дазваляюць не прызначаць таргі на правядзенне бягучага рамонту. Цяпер рашэннем адміністрацыі можна прызначыць дзяржарганізацыю, якая выканае ўсё належным чынам, што мы і зробім, —* паабяцаў ён.

Па пытанні даплаты да пенсіі дзядулю як ліквідатару мінулы раз Мінпрацы не знайшло ніякіх пацвярджальных дакументаў. Гэтым разам Алег Вацлававіч знайшоў паперу, дзе сказана, што яму ў 1990-х гадах даплачвалі грошы як ліквідатару наступстваў на ЧАЭС.

— *Нам тады плацілі 20-працэнтную надбаўку за работу, і не было ніякіх дакументаў камандзіровачных, якія цяпер ад мяне патрабуюць. Пасля я не афармляў нічога — мне хапала заробку, а зараз шмат трэба на лекі, вось я і чэкі прынёс.*

У той час Алег Хруцкі быў начальнікам БПМК-104. Жывы яшчэ і той, хто быў галоўным інжынерам.

— *У Мінгарвыканкаме ёсць камісія аб устанаўленні статусу, куды яму трэба звярнуцца. У выпадку адмовы — звярнуцца ў суд і прывесці гэтага сведку, які мае пасведчанне ліквідатара, каб устанавіць факт удзелу, —* параіла **Вольга Спірыдонава, начальнік упраўлення арганізацыі і пенсіённага забеспячэння Мінпрацы.** — *Пры станоўчым вырашэнні пытання яму прызначаць надбаўку ў 42 рублі — 50 % мінімальнай пенсіі па ўзросце.*

Праблема ў тым, што пакрыўджаны ў свой час чалавек не хоча звяртацца ў суд, бо гонар не дазваляе, таму Таццяна Рунец параіла яму аформіць даверанасць на сваякоў, каб нехта прадстаўляў яго інтарэсы ў судзе. А адносна дарагіх лекаў сенатар папрасіла разгледзець пытанне і аказаць пенсіянеру грашовую дапамогу старшыню Адміністрацыі Цэнтральнага раёна.

### НЕДАПЛАЧАНАЯ ПЕНСІЯ І ШТРАФЫ ЗА БАЛЬНІЧНЫ

Ветэран працы Аляксандр Барнатовіч мяркуе, што пры налічэнні пенсіі яму не ўлічылі досыць небяспечныя ўмовы 14 гадоў работы юрысконсультам у папраўчай калоніі.

— *Для работы з асаблівымі ўмовамі працы ў краіне існуе два спісы, ні ў адзін з якіх пасада юрысконсульта не ўваходзіць, — заўважыла на гэта прадстаўніца Мінпрацы. — Аднак зараз у краіне пенсія па ўзросце і пенсія па ўзросце па прафесіях, якія ўваходзяць у спісы, налічваюцца абсалютна аднолькава — ніякіх прыбавак і павышальных каэфіцыентаў не будзе. Адзіная льгота — больш ранні выхад на пенсію, калі прафесія ў спісе.*

Мужчына, аднак, упэўнены, што яму варта нейкім чынам пацвердзіць шкодныя і асаблівыя ўмовы працы, каб атрымаць даплату, інакш ён звернецца ў суд.

— *Мы можам, пэўна, выступіць з ініцыятывай, каб умовы працы грамадзянскіх асоб у такіх месцах былі нароўні з катэгорыяй ваеннаслужачых, — разважае Таццяна Рунец. — Аднак пенсія ад гэтага не павялічыцца. Да таго ж, на работу ў калонію грамадзянскія служачыя ідуць па сваёй волі, а ваеннаслужачыя — па загадзе. Тым не менш мы падумаем, што з гэтым можна зрабіць, і дашлём адказ.*

Пенсіянер, які працуе ахоўнікам у краме адной гандлёвай сеткі, скардзіцца, што ў яго і іншых работнікаў з зарплаты сістэматычна робяць вылічэнні па 100-150 рублёў, калі работнік не можа выйсці на працу, бо захварэў і пайшоў на бюлетэнь. Бальнічны выплачваюць, а потым бяруць штраф, што ён не працаваў.

— *У кастрычніку я адпрацаваў 205 гадзін (17 рабочых дзён), а ў разліку ўказана 168 гадзін (16 рабочых дзён). 168 гадзін — гэта норма, а тое, што звыш, нам нікому не ўлічваюць. Акрамя таго, не плацяць у двайным памеры за дні, якія пры бягучым графіку прыпадаюць на выхадныя. Зарплату таксама выдаюць не ў дакладна вызначаныя дні... І разліковыя лісткі толькі пасля выдачы зарплаты, —* скардзіцца мужчына.

— *Сапраўды, нават пры такім графіку, калі ваш працоўны дзень супадае са святочным, вы павінны атрымліваць за гэта даплату, —* пагадзілася **Вольга СБІТНЕВА, намеснік начальніка ўпраўлення нагляду за выкананнем заканадаўства аб працы Дэпартамента дзяржінспекцыі працы.** — *Аднак толькі па заяве работніка нельга выйсці з праверкай на прадпрыемства.*

— *Мы можам запрасіць ваша кіраўніцтва да нас на размову і ў прысутнасці прадстаўніка Дэпартамента дзяржінспекцыі па працы папрасіць яго патлумачыць, што адбываецца, каб высветліць усе абставіны, —* прапанавала сенатар.

Падчас гутаркі высветлілася, што ў названай гандлёвай сеткі няма прафсаюза, таму гэтае пытанне таксама варта ўзняць.

### ПАТРЭБНА 12 МІЛЬЁНАЎ ДОЛАРАЎ

Самымі заўважнымі наведвальнікамі сталі Тамара Ваземілер і Аляксандр Дарашкевіч, якія хочуць наладзіць у Беларусі вытворчасць гумавых медыцынскіх коркаў і шукаюць пад гэты інавацыйны праект 12 мільёнаў долараў інвестыцый.

— *Раней такую прадукцыю завозілі ў Беларусь з іншых краін — цяпер такой магчымасці няма. Таму мы і хочам дапамагчы краіне наладзіць вытворчасць на месцы. Айчынных вытворцаў няма. І Міністэрства аховы здароўя ў гэтым зацікаўлена. Рабіць коркі будзем з бромбутылкаўчуку, закупляючы яго ў Расіі, —* расказаў Аляксандр Дарашкевіч.

Збудаваць завод, які акупіцца за сем гадоў, энтузіясты плануюць на паўтара года ў свабоднай эканамічнай зоне «Брэст», — *мясцін,* адкуль родам Тамара Ваземілер, у якой засталося шмат карысных сувязяў. Жанчына, дарэчы, прадпрымальнік не з нуля. Яна ўзначальвае арганізацыю «Дом моды Тамара», дзе вырабляюць аднаразовыя медыцынскія маскі. Кажуць, іх вырабы больш якасныя і зручныя.

— *Наша вытворчасць масачная ўжо загружаная да верасня, так што попыт ёсць. І коркі нашы таксама будуць па якасці шыкоўныя. Аднак патэнт мы рабіць не хочам, бо валодаем унікальнай формулай, якой дзяліцца не будзем, — інакш яе выкрадуць. Мы гатовы да любых іспытаў якасці нашай прадукцыі. А ў будучыні зможам экспартаваць прадукцыю і ў краіны СНД.*

Сапраўды, у краіне каля дзясятка арганізацый Міністэрства аховы здароўя, якія маюць патрэбу ў корках і цяпер купляюць іх за мяжой, пацвердзіў **Пётр АРУШАНЬЯНЦ, генеральны дырэктар Беларускага фонду фінансавай падтрымкі прадпрымальнікаў:**

— *Такая сума будзе не зусім бесперспектыўнай у частцы інавацыйнага фонду Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях (ДКНТ). Наш фонд жа працуе з малым бізнесам, і ў нас мікрапазыкі. У інавацыйным фондзе, магчыма, можна знайсці інвестара на дварты мільёны, а астатнюю частку прасіць ужо ў банка. Мы можам распаўсюдзіць інфармацыю і ў Расіі, каб знайсці спонсара, аднак тэба выкласці ў доступ патэнт.*

— *Знайсці інвестара на такую вялікую суму, які зможа чакаць аддачы сем гадоў, практычна немагчыма, —* лічыць Таццяна Рунец. — *Усе выступчасці ў краіне пачынаюць будаваць за кошт крэдытных рэсурсаў. А пасля ўжо, калі відаць, што справа добрая, можа далучыцца дзяржава. Тым больш што для гарантыі патрэбна забеспячэнне, якога ў вас няма.*

Аднак інавацыйны фонд на гэты год ужо размеркаваны, таму дырэктар беларускага фонду ДКНП параіў прадпрымальнікам усё ж пачынаць з малога. Узяць першы крэдыт і пачаць будаваць, — потым, пэўна, будзе лягчэй падцягнуць наступныя грошы, калі будзе вымалёўвацца вынік.

Калі ж рабіць гэта праз інвестпраграму, то на чале такога праекта будзе нейкае буйное прадпрыемства, а не прадпрымальнікі, мяркуе сенатар. Тым не менш ідэю яна паабяцала агучыць Наталлі Качанавай.

**Ірына СІДАРОК,**
**фота аўтара.**

# З АДКАЗНАСЦЮ ПЕРАД ГРАМАДСТВАМ

## Магілёўскія дэпутаты падвялі вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна і работы прэзідыума аблсавета за мінулы год

**Вырашэнне пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва, рэалізацыя рашэнняў VI Усебеларускага народнага сходу, а таксама дзяржаўных і рэгіянальных праграм — тры галоўныя кіты, на якіх была пабудавана работа мясцовых Саветаў дэпутатаў. Пра тое, як яна праводзілася, расказала падчас чарговай 44-й сесіі аблсавета Магілёўскага абласнога Савета дэпутатаў яго старшыня Ірына Раінчык.**

Найбольш эфектыўнымі формамі работы з насельніцтвам, на яе думку, застаюцца асабістыя прыёмы грамадзян у выбарчых акругах, прамыя тэлефонныя лініі, дні дэпутата, дні Савета, сустрэчы па месцы жыхарства. Падчас такіх мерапрыемстваў усплываюць розныя праблемныя пытанні, якія хвалююць людзей.

У 2022 годзе дэпутатамі аблсавета праведзена больш за 600 прыёмаў грамадзян і прамых тэлефонных ліній, разгледжана каля дзвюх тысяч пытанняў. Непасрэдна ў абласны Савет жыхары звярталіся па пытаннях працаўладкавання, афармлення праваўстанаўляльных дакументаў, налічэння жыллёва-камунальных плацяжоў, добраўпарадкавання населеных пунктаў, рамонту дарог, стану пітной вады, капітальнага рамонту жылфонду і іншых. У практыку прэзідыума аблсавета ўвайшоў разгляд зваротаў грамадзян з выездам на месца ў складзе рабочай групы з дэпутатамі мясцовых Саветаў і прадстаўнікамі выканаўчых органаў улады. Як паказваў вопыт, пытанні ў гэтым выпадку вырашаюцца аператыўна.

Станоўча зарэкамендавала сябе і практыка правядзення сумесных прыёмаў з дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і членамі дэпутацкай групы грамадскай арганізацыі «Белая Русь».

Летась з падачы прэзідыума Магілёўскага аблсавета традыцыйнымі сталі сустрэчы прадстаўнікоў Маладзёжнага парламента са спецыялістамі па рабоце з моладдзю вядучых арганізацый вобласці і прадпрыемстваў. На форуме «Новы фармат» удзельнікі прэзентавалі найлепшыя маладзёжныя практыкі, абмяняліся досведам работы, вызначылі задачы на перспектыву.

Прааналізаваць, як у раёнах працуюць дзяржаўныя праграмы, дапамагаюць выязныя сесіі аблсавета, у якіх

удзельнічаюць дэпутаты ўсіх узроўняў. Падчас іх народныя абраннікі знаёмяцца з сацыяльна-эканамічным патэнцыялам пэўнай мясцовасці, сустракаюцца з неабыякавымі, ініцыятыўнымі грамадзянамі.

Дэпутаты вобласці працягвалі ўзаемадзейнічаць з актыўнымі прадстаўнікамі насельніцтва, дапамагаць ім рэалізоўваць грамадзянскія ініцыятывы. Адбыўся абласны конкурс, у выніку якога сем ініцыятыў былі падтрыманы не толькі арганізатарамі, але і Банкам развіцця Беларусі. Агульная сума, якая была выдзелена на рэалізацыю народных праектаў, склала 100 тысяч рублёў.

У прыватнасці, каля крыніцы ў вёсцы Барысавічы Клімавіцкага раёна створана камфортная зона адпачынку, у раёне пасёлка Дачны Магілёўскага раёна з'явілася цікавая грамадская прастора. Больш функцыянальнай стала зона адпачынку мікрараёна «Цэнтральны» ў Чавусах. У Быхаве створаны спартыўны гарадок, у Бабруйску каля жылога дома № 30 па Георгіеўскім праспекце матэрыялізавалася зручная і для дзяцей, і для дарослых гульнявая пляцоўка і зона адпачынку. Аграрагарадок Фашчаўка ў Шклоўскім раёне атрымаў магчымасць пабудаваць дзіцячы гульнявы парк, каля знакамітай Блакітнай крыніцы ў Слаўгарадскім — з'явілася пешаходная сцяжынка і пандус для калясачнікаў. Каардынацыяй і фінансаваннем усіх гэтых праектаў займалася Магілёўская абласная асацыяцыя мясцовых Саветаў дэпутатаў. А рэалізаваны праекты пры непасрэдным удзеле мясцовых грамадзян, якія якраз і праявілі ініцыятыву.

— І гэта толькі малая частка таго, што мы робім для ўстойлівага развіцця кожнага раёна вобласці, — удакладніла дырэктар асацыяцыі Паліна ЦЕРАШКОВА. — Напрыклад, летась пераможцамі конкурсу найлепшых практык па рэалізацыі СУР-2035, які праводзіўся ў рамках Тыдня ўстойлівага развіцця, сталі ініцыятыва жыхароў Чавус па стварэнні тэрыторыі сацыяльнага прыцягнення і зносін «Вадатрыум» і праект па стварэнні мемарыяльнага комплексу «Памяць расстраляць немагчыма» ў Круглым. Мы заахвочваем насельніцтва, каб яно прымала непасрэдны ўдзел у рэалізацыі Стратэгіі ўстойлівага развіцця Магілёўскай вобласці на перыяд да 2035 года.

Плённа развіваецца міжнароднае супрацоўніцтва з расійскімі рэгіёнамі. У стадыі прапрацоўкі знаходзяцца пытанні па развіцці лакальнай эканомікі, чалавечага патэнцыялу ў культурнай і прадпрымальніцкай сферах, захавання гістарычнай спадчыны канкрэтных населеных пунктаў Магілёўскай вобласці.

— Не ўсю работу можна вымераць лічбамі — значна больш шануецца выхаванне ў людзях сацыяльнай адказнасці, грамадзянскай пазіцыі і актыўнасці, — падкрэсліла Ірына Раінчык. — Безумоўна, работа прэзідыума Магілёўскага аблсавета, дэпутацкага корпуса вобласці, органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання служыць на карысць жыхарам Прыдняпроўскага краю і грамадству ў цэлым. Наша цеснае ўзаемадзеянне — гэта практыка, калі грамадства бярэ на сябе адказнасць і гатова ўдзельнічаць у рашэнні задач сацыяльна-эканамічнага развіцця вобласці.

У рабоце сесіі прынялі ўдзел старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Ісачанка, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, дэпутаты, кіраўніцтва Магілёўскага аблвыканкама, кіраўнікі структур арганізацый і службаў. Перад сесіяй удзельнікі азнаёміліся з выставай, дзе быў прадстаўлены патэнцыял Магілёўскай вобласці.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

# КОЛЕР ДАСТАЎКІ — СІНІ

***(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)***

— Вяскоўцы сёння могуць заказаць поштай усё што заўгодна: ад бялізны да веласіпеда ці камбікорму, ад цукру да цэменту, — тлумачыць Наталля Бурлакова і паказвае сваё галоўнае рабочае «ўзбраенне» — «Мабільны паштальён». Гэта апаратна-праграмны комплекс з выхадам у інтэрнэт і рэспубліканскую сістэму аплаты, які дазваляе праводзіць усе безнаяўныя і наяўныя плацяжы онлайн падчас абслугоўвання дома.

— У нас здарылася любоў з першага погляду, — дзеліцца пастаянная клієнтка надомнага абслугоўвання паштальёна ў Міхнавічах Паліна Іонава. — Вельмі ветліва ўсё, акуратна, прыстойна. І гэта не толькі мне даспадобы, але і ўсёй вёсцы. — Паліна Сцяпанаўна бянтэжыцца ад увагі прэсы, але жаданне зрабіць камплімент паштальёну перамагае. — Я ў асноўным заказваю прадукты па пошце, плачу «камуналку», кладу грошы на інтэрнэт і тэлефон. Атрымліваю таксама пенсію, бо сучаснай карткай карыстацца я ўжо не змагу.

Паліна Сцяпанаўна ў родных Міхнавічах 15 гадоў адпрацавала настаўніцай у школе, потым бібліятэкарам пры Доме культуры. Таму пенсіянерка вельмі добра разумее перажыванні людзей, калі важныя сацыяльныя аб'екты на вёсцы закрываюцца. Яна лічыць, што трэба настройвацца на лепшае. Мара жанчыны цяпер — каб яе любімы мабільны паштальён мог з карткі выдаць наяўныя грошы.

— Праз мабільнага паштальёна атрымліваю пенсію, купляю ўсе прадукты, якія патрэбны, — падзялілася ўражаннямі яшчэ адна адрасатка, да якой разам з экіпажам мабільнага паштальёна заязджаем у Міхнавічах, — Тамара Дзейкун.

— І будаўнічыя матэрыялы нам пошта дастаўляе, — дадае жыхарка Міхнавічаў Наталля Петрушэнка. — Адной маёй падапечнай прывезлі днямі сетку Рабіца, цэмент: агароджу хоча ставіць. Прывозяць і рубероід, ды і любы будаўнічы матэрыял. Яшчэ і ў двор занесці дапамогуць.

Наталля Уладзіміраўна амаль усё жыццё адпрацавала ў сельсавеце. Цяпер у роднай вёсцы яна — сацыяльны работнік, таму дакладна ведае, з якімі праблемамі сутыкаюцца тутэйшыя пенсіянеры. Іх у вёсцы 39 і ўсе без паштовых паслуг нікуды.

— Нашы людзі задаволеныя такім абслугоўваннем дома. Не чула, каб скардзіліся, што нешта не даставілі ці прывезлі не ў тэрмін, — кажа Наталля Петрушэнка.

Стацыянарнае аддзяленне сувязі ў Міхнавічах закрылася ў 2019 годзе, але засталося працаваць у цэнтры сельсавета — Якімавічах. Выкананне патрабаванняў дзяржаўнага сацыяльнага стандарту па дастаўцы пошты — пад пільным кантролем мясцовых органаў улады, акцэнтуе ўвагу **старшыня Якімавіцкага сельвыканкама Калінкавіцкага раёна Рыта СТРЭЛЬЧАНКА.**

— Безумоўна, спачатку ў людзей былі хваляванні, калі ў аддаленых вёсках зачынялі паштовыя аддзяленні. Але былі і іншыя аб'ектыўныя прычыны. Напрыклад, у Міхнавічах, хоць населены пункт значны — больш за 300 жыхароў, — доўгі час была праблема з супрацоўнікам аддзялення. Тут побач чыгуначная станцыя, многія працуюць у горадзе, а вёска ператвараецца ў населены пункт пенсіянераў і дачнікаў. За пэўны час работу

перасоўнай і мабільнай пошты наладзілі. Таму апошнія гады ніякіх скаргаў ці заўваг ад людзей наконт паштовых паслуг не паступае. Калі ёсць пэўныя адзінкавыя моманты, аператыўна перадаю просьбы і заўвагі ад людзей кіраўніцтву Калінкавіцкага рэгіянальнага вузла паштовай сувязі, — адзначае старшыня Якімавіцкага сельвыканкама.

### Каса дадому

Увогуле 11 супрацоўнікаў Калінкавіцкага рэгіянальнага вузла паштовай сувязі працуюць на вёсцы паштальёнамі па суправаджэнні і абмене пошты. Яны абслугоўваюць не толькі ўсе населеныя пункты Калінкавіцкага раёна, але і частку вёсак Петрыкаўскага. Штодзень з Калінкавіцкага вузла адпраўляецца ў сельскае паштовае дзяжурства 12 машын.

— У Калінкавіцкім і суседніх Петрыкаўскім, Жыткавіцкім раёнах сельскія населеныя пункты, дзе няма стацыянарных паштовых аддзяленняў сувязі, усе паштовыя паслугі насельніцтву аказваюць паштальёны па суправаджэнні пошты. У Калінкавіцкім раёне на мотадастаўку пераведзена амаль 140 населеных пунктаў, — растлумачыла **начальнік аддзела паштовай апрацоўкі, сартавання і дастаўкі Калінкавіцкага рэгіянальнага вузла паштовай сувязі Святлана КРОГАЛЬ.**

У Жыткавіцкім вузле паштовай сувязі, які таксама адносіцца да Калінкавіцкага рэгіянальнага вузла паштовай сувязі Гомельскага філіяла РУП «Белпошта», — свая вясковая лагістыка: шэсць маршрутаў абслугоўваюць сельскія населеныя пункты Жыткавіцкага раёна і частку Петрыкаўскага.

— Паштальён па суправаджэнні пошты абслугоўвае не толькі населеныя пункты, пераведзеныя на аўтамабільную дастаўку, але і забяспечвае комплекс паслуг — прыём плацяжоў, дастаўку газет, паштовых адпраўленняў, — а таксама адказвае за абмен паштовай прадукцыяй з тымі сельскімі аддзяленнямі сувязі, якія знаходзяцца на маршруце, — падкрэсліла спецыяліст. — У любым выпадку наша задача — трымаць на кантролі якасць ахопу сацыяльна значнымі паслугамі вяскоўцаў і выкананне патрабаванняў дзяржаўнага сацыяльнага стандарту па дастаўцы пошты.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота аўтара.**

*Калінкавіцкі раён.*

ТЭРЫТОРЫЯ РАЗВІЦЦЯ

# СПАДАРОЖНІК ВЫХОДЗІЦЬ НА АРБІТУ,

## або Якімі стануць Смалявічы ў перспектыве

**У 2014 годзе Смалявічам прысвоены статус горада-спадарожніка. Гэта надало новы імпульс для развіцця не толькі горада, але і ўсяго рэгіёна ў цэлым. Асабліва актыўна гэтыя працэсы ідуць у апошнія гады. У 2020—2022 гадах уведзена ў эксплуатацыю 304,8 тысячы квадратных метраў жылля, у шматкватэрных дамах за гэты перыяд палепшылі жыллёвыя ўмовы 478 шматдзетных сем'яў.**

— Інтэнсіўнае жыллёвае будаўніцтва і рост колькасці насельніцтва абумоўліваюць неабходнасць стварэння і паляпшэння інжынерна-транспартнай і сацыяльнай інфраструктуры, умацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы аб'ектаў адукацыі і аховы здароўя, стварэння камфортных умоў для жыцця людзей. І гэтаму кірунку з боку кіраўніцтва раёна ўдзяляецца асаблівая ўвага, — распавяла **старшыня Смалявіцкага раённага Савета дэпутатаў Марына КЛЮЕВА.** — У лістападзе 2020-га ў горадзе пабудаваны яслі-сад на 230 месцаў, што дазволіла зняць вастрыню праблемы недахопу месцаў у дзіцячых дашкольных установах. Цяпер завяршаецца будаўніцтва яшчэ аднаго сада. У жніўні 2022-га ўведзена ў дзеянне сучасная школа на 720 месцаў з басейнам. Нядаўна гандлёвая сетка горада папоўнілася новым гандлёва-забаўляльным цэнтрам, у найбліжэйшых планах — яшчэ адзін.

Як адзначыла Марына Клюева, сёлета плануецца будаўніцтва паліклінікі на 360 месцаў, знос старой і ўзвядзенне новай школы № 3 у Паўднёва-Заходнім мікрараёне. Вядуцца праектныя работы па будаўніцтве аўтастанцыі. Адкрыццё парку з дзіцячымі пляцоўкамі і фантанам на вуліцы Камсамольскай паклала пачатак развіццю аб'ектаў для адпачынку і заняткаў спортам. Любімым месцам для гараджан стала прыбярэжная зона Смалявіцкага вадасховішча. Пляцоўкі для стрытбола, валейбола, скейтбордынга, тэніса і заняткаў варкаўтам, тратуары і веладарожкі для прагулак, уладкаваная пляжная зона дазваляюць выбрацца від адпачынку на любы густ і стваряюць добры настрой.

Разам з тым у раёне на пастаяннай аснове ажыццяўляецца шэраг мерапрыемстваў, магчыма, не такіх яркіх і прыкметных, але неабходных людзям, якія аказваюць уплыў на якасць жыцця.

— У прыватнасці, ідзе замена сетак цеплаводазабеспячэння і водаадвядзення, будаўніцтва станцый абезжалезвання, рэканструкцыя ачышчальных збудаванняў, вулічнай і дарожнай сетак горада з уладкаваннем пешаходных сувязяў.

Марына Клюева адзначыла, што паралельна з развіццём новых мікрараёнаў вялікая ўвага надаецца ўмацаванню матэрыяльна-тэхнічнай базы існуючых сацыяльных аб'ектаў, рамонту ўстаноў адукацыі і аховы здароўя, удасканаленню іх інфраструктуры. Ва ўстановах адукацыі праведзены замена вокнаў, рамонт. Мадэрнізацыя закранула і медыцынскія ўстановы. За апошнія тры гады на гэтыя мэты зрасходавана больш чым пяць мільёнаў рублёў. Акрамя таго, у гарадскіх школах № 1 і № 2 мадэрнізаваны спартыўныя аб'екты, уладкаваны футбольныя пляцоўкі са штучнай травой, валейбольна-баскетбольныя пляцоўкі з гумавым пакрыццём, бегавыя дарожкі і скейт-пляцоўкі.

У межах падрыхтоўкі да раённага свята «Дажынкі» абноўлена сацыяльная інфраструктура ў аграгарадку Слабада, добраўпарадкавана тэрыторыя, пабудаваны спартыўныя і дзіцячыя пляцоўкі.

— Адзначу, што дынамічнаму развіццю горада-спадарожніка і рэгіёна ў цэлым удзяляецца вялікая ўвага і падтрымка з боку кіраўніцтва Мінскай вобласці, — падкрэсліла старшыня раённага Савета дэпутатаў.

Зразумела, рашэнне вялікіх і малых задач па жыццезабеспячэнні насельніцтва было б немагчымым без стабільнай работы рэальнага сектара эканомікі раёна. Больш чым на 90 працэнтаў раённы бюджэт фарміруецца за кошт падатковых паступленняў.

Як і ў папярэднія гады, бюджэт захоўвае сацыяльную накіраванасць. На фінансаванне сацыяльнай сферы ў гэтым годзе плануецца накіраваць 53,2 працэнта. Каля 64 працэнтаў у структуры бюджэту займаюць першачарговыя расходы. Акрамя таго, у раёне запланаваны сродкі на развіццё сацыяльнай сферы і інжынерна-транспартнай інфраструктуры ў памеры 17 працэнтаў ад аб'ёмаў бюджэту. Сярэдняя заработная плата за студзень—снежань мінулага года склала 1616,5 рубля.

— Сітуацыя на рынку працы раёна характарызуецца як стабільная і кіраваная. Узровень беспрацоўя склаў на канец 2022 года 0,04 працэнта. Наймальнікамі на тэрыторыі раёна заяўлена больш як дзве тысячы вакансій па розных спецыяльнасцях, —адзначыла Марына Клюева.

Такім чынам, стан сацыяльнай сферы, узровень камфорту і дабрабыту жыхароў, магчымасць аператыўнага вырашэння тых ці іншых праблемных пытанняў, што ўзнімаюць людзі, самым цесным чынам звязаны з паспяховай работай эканомікі — прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў, прыватнага бізнесу, сферы гандлю і паслуг.

— У сваю чаргу паспяховае функцыянаванне рэальнага сектара эканомікі, магчымасць кожнага жыхара плённа працаваць дзеля развіцця нашай малой радзімы мы маем дзякуючы стабільнай сітуацыі ў краіне, мудрым і ўзважаным рашэнням, правільнай палітыцы дзяржавы, — сказала напрыканцы Марына Клюева.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

НАШЫ ЛЮДЗІ

# СТАРАСТАЙ ВЁСКІ — 37 ГАДОЎ?

## Гэта пра Ванду Раслякову

**Калі Ванда Паўлаўна сказала, што старастай у Галоўчыцах яна з 1985 года, мы не тое каб не паверылі, — здзівіліся, сталі падлічваць. Бо прывыклі, што інстытут старастаў у вёсках культывуецца недзе з сярэдзіны 1990-х гадоў. Але ж узнік ён сапраўды не на пустым месцы. І ў савецкі перыяд у многіх населеных пунктах абіралі старасту.**

Вось і ў Галоўчыцах так было. Менавіта яе, бібліятэкара ва ўзросце за трыццаць, актывістку грамадскага жыцця, на сельскім сходзе абралі старастай.

— Некалі ў нас жыццё віравала, — расказвае Ванда Паўлаўна. — Быў торфазавод, выпускалі за год тон 300 торфабрыкету, нават дамы для работнікаў завода будавалі. У вёсцы былі школа, дзіцячы садок, клуб з бібліятэкай, ФАП, крама, лазня — адным словам, уся інфраструктура. Цяпер з усяго пералічанага засталася толькі крама.

Хоць па адукацыі яна гандлёвы работнік, але давялося працаваць у бухгалтэрыі, у дзіцячым садку. Апошнія ў працоўнай біяграфіі 34 гады шчыравала ў бібліятэцы. Менавіта тады яна разам з вясковымі актывістамі арганізоўвала святочныя і іншыя мерапрыемствы — не злічыць, колькі правялі суботнікаў, працоўных дэсантаў па прыборцы тэрыторыі, па навядзенні парадку на могілках. Стараста згадала, як цікава арганізоўвалі дні вёскі: да падрыхтоўкі прыцягвалі многіх вяскоўцаў, запрашалі самадзейных артыстаў. Потым, калі клуб і бібліятэку скасавалі, будынак доўга яшчэ служыў людзям у якасці Дома сацыяльных паслуг. Там таксама ладзілі святы, збіраліся на сустрэчы з прадстаўнікамі раённай улады, медыкамі, спецыялістамі, якія наведвалі вёску падчас інфармацыйных дзён.

Вёска, на жаль, не расце, а, наадварот, меншае. Некалькі гадоў таму будынак, дзе быў Дом сацыяльных паслуг, прадалі прадпрымальніку. Цяпер адзіным грамадскім месцам для Галоўчыц, дзе пад сотню жыхароў, застаецца крама. Але ж стараста, як і раней, заўсёды на сувязі з сельскім Саветам.

Яго **старшыня Вячаслаў РУСАКЕВІЧ** гаворыць, што Ванда Паўлаўна ў ліку самых актыўных старастаў. Да таго ж у яе ёсць надзейная апора і памочнік — муж Аляксей Міхайлавіч.

Калі мінулай восенню вялі вялікую работу па ачыстцы абочын дарог ад лішніх дрэў і хмызняку, Аляксей Раслякоў усе дні шчыраваў з работнікамі дарожных службаў. Дзе вялікая тэхніка не праходзіла, там вясковы ўмелец са сваімі механічнымі прыстасаваннямі вывозіў галлё і драўляныя адходы. Аляксей Міхайлавіч — на ўсе рукі майстар. У яго ёсць, напрыклад, не зусім звычайная «веламашына». Да веласіпеда прырабіў маторчык ад бензакасы, і цяпер гаспадар — на колах. «Мая машына безадмоўная: трэба пад'ехаць хутка — ускочыў, завёўся і паехаў, а калі бензін скончыцца, не бяда — круці педалі».

Раней Ванда Паўлаўна, калі трэба было па справах, сядала на веласіпед і ехала, нават у Дзмітравічы, у сельсавет. Цяпер з мабільнасцю яе выручае муж.

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
*Камянецкі раён.*

Ванда і Аляксей РАСЛЯКОВЫ.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. **Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 311 17 35;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 03.04.2009. 220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.

Тыраж 10.681. Нумар падпісаны ў 19.30 14 лютага 2023 года.

Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5 |
| **Продавец** | Березинский ф-л Минского областного потребительского общества, Минская обл., Березинский р-н, г. Березино, ул. Октябрьская, 17 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |
| **Предмет электронных торгов** | |

**Кафе «Молодежное»** (93,1 кв. м, 611/С-38515, составные части и принадлежности: сарай, уборная).
Адрес: **Минская обл., Березинский р-н, г. Березино, ул. Комсомольская, 2.**

***Сведения о земельном участке*: пл. 0,0300 га,** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 20.04.2070) для обслуживания кафе «Молодежное» (для размещения объектов общественного питания)

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 68 092,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в размере **3 %** от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов.

Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» 27.10.2022

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов – в 11.00 28.02.2023. Окончание торгов – в 12.00 28.02.2023.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 27.02.2023 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** |

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06, auction@cpo.by**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Лида-агротехсервис»**

**Аукцион состоится 27.02.2023 г. в 14.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| **Лот № 1** | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ 1:<br>- капитальное строение, инв. № 420/С-42745 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – проходная), общей площадью 48,2 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Дзержинского, д. 73, корп. 1;<br>- капитальное строение, инв. № 420/С-4534 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание конторы), общей площадью 204,7 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Дзержинского, д. 73;<br>- капитальное строение, инв. № 420/С-100411 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – сооружение благоустройства), общей площадью 13678 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Дзержинского, д. 73, сооружение благоустройства;<br>- капитальное строение, инв. № 420/С-4533 (назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – душевая), общей площадью 46 кв. м, расположенное по адресу: г. Лида, ул. Дзержинского, д. 73;<br>- оборудование: кран козловой КК 10-25, 1976 г. в.; кран козловой КС-12,5/20, 1985 г. в.; котел газовый напольный К45-8Е23 Supraline, 2011 г. в.; комплектная трансформаторная подстанция (КТП) № 137, 1993 г. в.<br>Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 441300000011000280, площадью 2,5117 га (назначение – для обслуживания производственной территории), расположенном по адресу: г. Лида, ул. Дзержинского, 73. Земельный участок является неделимым и на данном земельном участке расположены иные объекты, не подлежащие продаже. Оформление земельного участка будет производиться после приобретения объекта в порядке, предусмотренном законодательством Республики Беларусь |
| **Начальная цена продажи** | 246 660 руб. (двести сорок шесть тысяч шестьсот шестьдесят рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 24 666 руб. (двадцать четыре тысячи шестьсот шестьдесят шесть рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18.<br>**Последний день приема заявлений – 23.02.2023 г. до 15.00** |
| Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 26.10.2022 г. | |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony | |

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор аукциона)
информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, находящегося в собственности Молодечненского района и в хозяйственном ведении
**УП «ИНСТИТУТ МОЛОДЕЧНОПРОЕКТ»**
(Продавец):

Лот № 1.

**Помещение бытового обслуживания населения, инв. № 630/D-42434, 881,1 кв. м.**

Адрес: Минская обл., Молодечненский р-н, г. Молодечно, ул. Будавников, 15А-4.

Начальная цена – 169 400,00 руб. без учета НДС.

**Аукцион состоится 09.03.2023 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.**

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу **gki.gov.by,**
Минского областного исполнительного комитета **minsk-region.gov.by,**
Организатора аукциона **ino.by.**

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

**ОАО «ПИНСКИЙ ВИНОДЕЛЬЧЕСКИЙ ЗАВОД»**

сообщает о проведении **20.03.2023 г.** первых электронных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества:

**1) Ящик полиэтиленовый в количестве 5000 штук стоимостью 2 рубля 50 копеек за один ящик на общую сумму 12 500 белорусских рублей без НДС.**

Подробную информацию можно узнать на сайте **bankrot.gov.by**

УНН 200110728

**Открытое акционерное общество «МАПИД»**

ОТЗЫВАЕТ ПРОЕКТНУЮ ДЕКЛАРАЦИЮ,
*опубликованную в газете «Звязда» 27 августа 2022,*
(о проекте строительства объекта «Жилой микрорайон в районе п. Сонечный Минского района» 4-я очередь строительства. Жилой дом № 1.1 по генплану»)
в связи с отсутствием спроса на данный объект и невозможностью ее реализации.

УНП 100008115

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» объявляет о проведении повторных электронных торгов № **2023.Ч.002.00024** по продаже имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by

**Продавец:** производственное унитарное предприятие «Пищевой комбинат Белкоопсоюза», г. Минск, пр-т Партизанский, 168, тел. +375 (017) 379-31-32.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, +375 (44) 709-55-52, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения повторных торгов: 02.03.2023 в 09.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Кап. строение с инв. № 500/С-45475 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168/2, площадью 2501,7 кв. м, назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование: склад сырья. Кап. строение с инв. № 500/С-42205 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168/18, площадью 328 кв. м, назначение: здание специализированное иного назначения, наименование: мехмастерские. Кап. строение с инв. № 500/С-42222 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168/15, площадью 489,0 кв. м, назначение: здание специализированное для общественного питания, наименование: столовая. Кап. строение с инв. № 500/С-45466 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168/17, площадью 125,3 кв. м, назначение: здание специализированное для обработки древесины и производства изделий из дерева, включая мебель, наименование: столярная мастерская. Кап. строение с инв. № 500/С-45467 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168/8, площадью 565,8 кв. м, назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование: склад сборный. Кап. строение с инв. № 500/С-42218 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168/3, площадью 1360 кв. м, назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Кап. строение с инв. № 500/С-42204 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168, площадью 240 кв. м, назначение: здание административно-хозяйственное, наименование: административно-бытовой корпус; составные части и принадлежности: проезд, 4 шт., площадка, 21 шт., дорожка, 3 шт., лестница, ограждение, 2 шт., бортовой камень, ворота 11 шт., калитка 3 шт., ограждение мет. Кап. строение с инв. № 500/С-42206 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168/1, площадью 29 кв. м, назначение: здание специализированное иного назначения; наименование: проходная с весовой. Кап. строение с инв. № 500/С-45465 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168/20, площадью 69,3 кв. м, назначение: здание специализированное энергетики; наименование: здание специализированное энергетики (подстанция). Кап. строение с инв. № 500/С-45470 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168/4, площадью 6,7 кв. м, назначение: здание специализированное иного назначения; наименование: водонапорная башня. Кап. строение с инв. № 500/С-45464 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168/19, площадью 18,8 кв. м, назначение: здание специализированное иного назначения; наименование: здание специализированное иного назначения (АТС).Кап. строение с инв. № 500/С-42217 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168/5, площадью 1322 кв. м, назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Кап. строение с инв. № 500/С-45468 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168/10, площадью 548,7 кв. м, назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование: склад МТС. Кап. строение с инв. № 500/С-42219 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168/11, площадью 1552 кв. м, назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование: фруктохранилище. Кап. строение с инв. № 500/С-42221 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168/13, площадью 1799,0 кв. м, назначение: здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака; наименование: консервный цех. Кап. строение с инв. № 500/С-42220 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168/12, площадью 2426 кв. м, назначение: здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака; наименование: соковый цех (Р1/к). Кап. строение с инв. № 500/С-42215 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168/7, площадью 710 кв. м, назначение: здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака; наименование: здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака. Кап. строение с инв. № 500/С-42216 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, 168/6, площадью 1011 кв. м, назначение: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование: здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ. Сооружение с инв. № 500/С-1013150 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, д. 168, протяженностью 2689,4 м, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадная хоз.-питьевая водопроводная сеть, составные части и принадлежности: Лит. А – внутриплощадная хоз.-питьевая водопроводная сеть, лит.Б – колодец, камера, лит.В – артезианская скважина № 1, лит. Г – артезианская скважина 1а, лит.Д – артезианская скважина № 2, лит.Е – артезианская скважина № 3.Сооружение с инв. № 500/С-1013155 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, д. 168, протяженностью 3231,05 м, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадочная хоз. - фекальная канализационная сеть, составные части и принадлежности: Лит.А – трубопровод хоз.-фекальной канализационной сети, лит.Б – выпуски, лит.В – колодец, камера, лит.Г – отстойники. Сооружение с инв. № 500/С-1013154 по адресу: г. Минск, пр-т Партизанский, д.168, протяженностью 1768,78 м, назначение – сооружение специализированное коммунального хозяйства, наименование – внутриплощадная ливневая канализационная сеть, составные части и принадлежности: Лит. А – трубопровод ливневой канализационной сети, лит. Б – выпуски, лит. В – колодец, камера, лит. Г – дождеприемник. Устройство низковольтное комплектное автом. систем управления электроприводами НКУ АСУЭ-НН/2-026-4-2-2-2-1IP65-УХЛ4, инв. № 1628. Счетчик импульсов Вега NB-11, подключенный к системе диспетчеризации, инв. № 1663. Счетчик холодной воды СТВХ-80, инв. № 1619. Кап. строения расположены на зем. участке с кадастровым № 500000000002005960 (право общего долевого постоянного пользования).

**Обременения по объектам недвижимого имущества:** договоры аренды, с условиями которых можно ознакомиться по предварительному согласованию с Продавцом, залог, ипотека ОАО «Сберегательный банк «Беларусбанк» (договор об ипотеке от 27.05.2020 № 5000390520-7; договор об ипотеке от 28.06.2022 № 5000200622-7). Запрет на отчуждение будет снят после оплаты Покупателем приобретенного предмета электронных торгов.

**Обременения по земельному участку** с кадастровым № 500000000002005960: сервитут (договор об установлении сервитута от 10.06.2011 № б/н), границы которого определены в земельно-кадастровом плане земельного участка.

**Нач. цена:** 7 073 567,40 бел. руб. с учетом НДС.

**Задаток:** 707 356,74 бел. руб.

Повторные электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by».

**Для участия** в электронных торгах необходимо ознакомиться с Регламентом ЭТП, пройти аккредитацию на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах в порядке, размещенном на сайте ЭТП.

**Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 01.03.2023.**

Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с: № BY93MTBK 30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Получатель – КУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Условия повторных электронных торгов:** Победитель эл. торгов (претендент на покупку) обязан в течение 10 (десяти) раб. дней со дня проведения эл. торгов возместить затраты на организацию и проведение эл. торгов, расходы Продавца на проведение независимой оценки предмета эл. торгов; оплатить услуги Оператора ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; подписать договор купли-продажи предмета эл. торгов в течение 15 (пятнадцати) раб. дней со дня проведения эл. торгов; оплатить предмет эл. торгов: если между Продавцом и Покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, оплата за предмет аукциона должна быть произведена в течение 30 (тридцати) календарных дней после подписания договора купли-продажи.

*Расходы продавца на проведение независимой оценки предмета эл. торгов составляют 9487,90 бел. руб. с НДС.*

Организатор электронных торгов имеет право отказаться от проведения электронных торгов в любое время, но не позднее, чем за три календарных дня до наступления даты их проведения.

Ранее опубликованное извещение – газета «Звязда» 31.08.2022, 11.10.2022, 12.11.2022, 29.12.2022.

С подробной информацией о предмете эл. торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by в разделе «Недвижимость». Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: +375 (25) 500 29 21 Протченко Татьяна Михайловна.

Спецыяльны рэпартаж

# РАМАН З КАВАЙ

## Карэспандэнты «Звязды» ўпадабалі духмяны бразільскі напой

**Пасольства Бразіліі зноў здзіўляла: раней мы разам слухалі басанову і хварэлі за Селесаа, а цяпер сонечнай лютаўскай раніцай атрымалі задавальненне ад смачнай духмянай кавы. Яно і зразумела: краіна — найбуйнейшы глабальны экспарцёр гэтай прадукцыі, без якой не ўяўляе свайго жыцця абсалютная большасць жыхароў планеты. Бразілія забяспечвае трэць сусветнага аб'ёму паставак кавы. Аб'ём вытворчасці — 50-60 мільёнаў мяшкоў (па паўсотні кіло) у год.**

— Кава насамрэч — сімвал Бразіліі, нездарма яна знаходзіцца на дзяржаўным гербе краіны, — адзначыў **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Федэратыўнай Рэспублікі Бразілія ў Рэспубліцы Беларусь Бернард Жорг Леапольд дэ Гарсія Клінгл.** — Мы прывезлі на дэгустацыю 12 найлепшых брэндаў кавы, у якіх найвышэйшая прафесійная ацэнка, і сабралі на дэгустацыю беларускіх прадстаўнікоў гэтай галіны, каб яны пакаштавалі напой і мелі магчымасць выхаду на прамыя кантракты з вытворцамі.

Капінг праводзіў сусветна вядомы **спецыяліст у галіне бразільскай спешэлці-кавы Эдгар Брэсані.** Ён прадстаўляў прадпрыемства з красамоўнай назвай Latitude (у перакладзе з партугальскай «шырата»).

— У Бразіліі кава вырошчваецца ў 34 рэгіёнах, якія знаходзяцца ў розных кліматычных умовах, на рознай геаграфічнай шыраце (паколькі краіна вялізная), — усміхаецца Эдгар Брэсані. — Мы — адзінае прадпрыемства, якое прадстаўляе самую шырокую лінейку бразільскай кавы з усіх рэгіёнаў, дзе яна вырошчваецца, і вельмі рады магчымасці пазнаёміць з ёю беларусаў.

Спешэлці — гэта кава, якая мае найвышэйшыя ацэнкі па прафесійнай шкале: звыш 80 пунктаў са 100. Бразілія канцэнтруецца на вытворчасці менавіта такой прадукцыі, бо краіна арыентуецца не на «вал», а на якасць. Адсюль і навуковы падыход, і новыя кірункі, накшталт ферментацыі, калі з кававымі зярняткамі абыходзяцца, быццам з вінаградам падчас прыгатавання віна. Як заўважыў Эдгар Брэсані, ёсць нават кава з двайной ферментацыяй.

І калі ва ўтульным сталічным рэстаране «Кампанія» заварылі духмяную бразільскую каву, букет пахаў насамрэч нагадаў добрае віно. І смак, паверце, заслугоўвае найвышэйшых пахвал. Таксама можна было прадэгуставаць і... чай з кававых кветак — каскару. Адным словам, суцэльнае захапленне — сапраўды раман з кавай. Тут словамі проста не перадаць — варта паспытаць. І было відаць, што такая прапанова вельмі зацікавіла прадстаўнікоў беларускіх кампаній, якія змогуць закупіць зялёную каву і ўжо на месцы абсмажыць яе. А мы абавязкова пакаштуем.

— Бразільская кава на беларускім рынку, нягледзячы на ўсе аб'ектыўныя неспрыяльныя фактары, не будзе ў дэфіцыце, — перакананы Бернард Жорг Леапольд дэ Гарсія Клінгл. — У гэтага цудоўнага рэчыва ёсць вельмі важная функцыя — сацыяльная. Людзі збіраюцца разам, размаўляюць, п'юць якасны духмяны напой. Кава насамрэч збліжае народы, збліжае нашы сэрцы.

Як прызнаўся Эдгар Брэсані, па «кававых справах» ён падарожнічае 180 дзён на год і ведае шмат адметных месцаў. Яму вельмі спадабаўся Мінск, у тым ліку вячэрні. «І людзі цудоўныя — яшчэ адна прычына неаднойчы сюды завітаць», — заўважыў Эдгар.

А што, прыязджайце, добрым гасцям мы заўжды рады. Кавы пап'ём.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

# Лясны сакрэт Лізаветы

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Абраць спецыяльнасць, звязаную з прыродным светам, дзяўчына вырашыла яшчэ ў дзяцінстве: яе заўсёды зачароўвалі дрэвы-веліканы, якія з маленькага семечка ператвараліся ў магутныя дубы і сосны, што падпіраюць буйнымі галінамі нябесны блакіт. Пасля заканчэння лесагаспадарчага факультэта Беларускага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта падалася ў Глыбоцкі вопытны лясгас, дзе яе размеркавалі ў Тумілавіцкае лясніцтва. І са жніўня ў Лізы пачалося рэальнае, зусім не па падручніках, асваенне прафесіі: кіламетры абходжаных лясных кварталаў, гадзіны начных дзяжурстваў, дзясяткі сустрэчных звяроў — ад самых замілавальных да самых вусцішных...

Дзяўчына займае пасаду майстра лесу: вызначае ўчасткі, дзе будзе праводзіцца высечка; кантралюе работу вальшчыкаў; сочыць за культурамі на доследным участку; праводзіць інвентарызацыю і піша накладныя; адпускае машыны з драўнінай. Па рабоце амаль кожны дзень знаходзіцца ў лесе, які, здараецца, сустракае не надта ветла. «Здаецца, што я бачыла ўжо ўсіх прадстаўнікоў жывёльнага свету Докшыцкага раёна: кабаноў, зайцоў, ласёў, казуль. Даводзілася бачыць і баброю, спрытных вавёрак. Адно ў маёй асабістай

гісторыі сустрэч няма рысі, аднак гэта больш плюс, чым мінус», — расказвае дзяўчына.

Прыгоду, якая здарылася з ёй першага снежня мінулага года, Ліза ўспамінае з выразным адценнем жаху. Аднойчы снежным днём дзяўчына была на ўчастку з вальшчыкамі, адтуль пешшу праз лес пайшла да другога квартала — не было машыны. Абед, як тое часта бывае, сустрэла ў лесе: прысела каля дарогі, каб перакусіць. Бакавым зрокам прыкмеціла дзве постаці і спачатку падумала, што гэта сабакі, аднак спакой хутка пераключыўся на асцярогу — да ног Лізы падбеглі двое медзведзянят, панюхалі, пачалі гуляцца адно з адным. Дзяўчына адразу ж зразумела, што дзесьці побач знаходзіцца мядзведзіца, і пачала тэлефанаваць калегам з просьбай дапамагчы. Махнатая маці не прымусіла сябе чакаць... «Я стаю на дарозе, каля ног круцяцца медзведзяняты, а насупраць з канавы на заднія лапы ўстае мядзведзіца... Я, здаецца, перастала дыхаць, у думках развіталася з роднымі і заплюшчыла вочы. Яна падышла, панюхала — прайшла нібы цэлая вечнасць...» Потым Ліза адчула, што мядзведзіцца падалася прэч, адбеглі і малыя, сцягнуўшы ў дзяўчыны рукавіцу з блінчыкам. Праз некалькі хвілін прыехалі калегі, доўга супакойвалі, аднак пасля яна ўсё ж не змагла заснуць цэлую ноч.

«Ведаеце, хтосьці рамантызуе гэту гісторыю: маўляў, малыя медзведзяняты такія мілыя. Аднак калі перад табой раптам паўстае буйны дзікі звер, які павінен быць у спячцы зімой, гэта выклікае канкрэтны адчай», — успамінае дзяўчына і называе 1 снежня сваім другім днём нараджэння.

Ужо потым ветэраны лясной гаспадаркі расказалі ёй, што тое месца завецца мядзведжым: там часта заўважаюць сляды і нярэдка сустракаюць гэтых звяроў. Дарэчы, папуляцыя бурых мядзведзяў за мінулы год на Віцебшчыне павялічылася ў два разы і дасягнула амаль тысячы асобін, яны зафіксаваны ва ўсіх раёнах вобласці. І ў Докшыцкім краі былі выпадкі, калі святар хаваўся ад драпежніка на дрэве, а сярод ляснічых хадзіў відэаролік, дзе медзведзяняты лазілі па ствалах, як кошкі.

Цяпер у лес Ліза выходзіць яшчэ больш асцярожна, аднак абраная прафесія не дазваляе быць адмежаванай ад прадстаўнікоў жывёльнага свету — так склалася, што лес вельмі хутка зладзіў маладому спецыялісту праверку на трывалась. Тым часам работнікі лясной гаспадаркі імкнуцца знайсці спосабы перасцерагчыся ад небяспекі з боку дзікіх жывёл: напрыклад, у некаторых месцах ёсць своеасаблівыя лесвічкі каля дрэў — для адыходу ад дзікоў. У пажаранебяспечны перыяд уваход у лес закрываецца шлагбаумам, а з мэтай выяўлення парушальнікаў парадку леснікі ўстанаўліваюць фотапасткі, якія рэагуюць на рух. Часта, вядома, на здымках, што аўтаматычна прыходзяць у лясніцтва, аказваюцца вавёркі, казулі і ласі; але ж часцей — людзі, якія імкнуцца ў лес у ягады раней за дазволены тэрмін; некаторыя грамадзяне спрабавалі нават красці фотапасткі, за што ім вокамгненна «прылятаў» не толькі штраф з адміністрацыйнай адказнасцю, але і «шчаслівае» фота на памяць.

Яшчэ пацікавілася ў дзяўчыны, ці знаходзіла яна падчас лясных вандровак рогі, што скідаюць ласі ўвесну. Яны як сімвал прафесіі ёсць амаль у кожнага лесніка, а вось Лізе знайсці іх пакуль не даводзілася — будучая вясна будзе першай у яе працоўнай дзейнасці.

Пасля двух гадоў работы ў лясніцтве малады спецыяліст плануе перайсці ў мясцовы гадавальнік, дзе вырошчваюць і дэкаратыўныя расліны, бо атрыманая спецыяльнасць усё ж схіляе ў бок азеляння. А ўсім, хто плануе звязаць жыццё з лясной гаспадаркай, дае параду: «У гэтай галіне зможа працаваць толькі той, хто па-сапраўднаму любіць лес з усімі яго сакрэтамі, не баіцца жывёльнага свету і ставіцца з увагай да кожнага складніка нашай прыроды».

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**
**Фота з архіва гераіні.**

# ВЕЧАЛЛЕ ПОМНІЦЬ

ВОСЕМДЗЯСЯТ гадоў мінула з часу, калі на возера Вечалле, што на ўскраіне Ушач, садзіліся самалёты... Так-так, у Полацка-Лепельскай партызанскай зоне гэтае прыгожае возера, як толькі надзейна замярзала, ператваралася ў аэрадром. Па сваіх прыродных параметрах возера нешырокае — усяго пяцьсот метраў, але ў даўжыню — больш за тры з паловай кіламетры: сапраўдная ўзлётна-пасадачная паласа. На Ушаччыне ў вайну дзейнічалі тры пасадачныя паласы і партызанскія аэрадромы, адзін з іх быў зімовы — на Вечаллі. У 1943—1944 гадах на ім садзіліся і ўзляталі лёгкія вінтакрылыя машыны з «вялікай зямлі».

Цяпер на беразе легендарнага возера знаходзіцца ўнікальны мемарыяльны знак — падобнага якому ў нашай краіне больш няма. Ва Ушацкім музеі народнай славы імя Героя Савецкага Саюза У. Е. Лабанка створана экспазіцыя, прысвечаная партызанскім аэрадромам, у тым ліку і вечальскаму. У музейных фондах захоўваюцца фатаграфіі лётчыкаў, якія прызямляліся на вечальскі лёд, дастаўлялі для народных мсціўцаў зброю, боепрыпасы, адзенне, лекі, забіралі цяжка параненых партызанаў. Зімовы аэрадром увайшоў у гісторыю вайны і доблеснай аперацыяй па выратаванні дзяцей з полацкага сірочага прытулку. Дзякуючы ваенным фотакарэспандэнтам і кінааператарам засталіся выявы лётчыкаў першай эскадрыллі 105-га гвардзейскага авіяпалка грамадзянскага паветранага флоту, якія ўдзельнічалі ў аперацыі. Сярод іх — легендарны Аляксандр Мамкін. Аперацыя называлася «Зорачка». Дзвесце дзяцей на падводах прывозілі да Вечалля, адкуль іх перапраўлялі на «вялікую зямлю». Лётчыкі здзейснілі па два начныя пералёты. У адным такім самалёт лейтэнанта Мамкіна быў прастрэлены варожым зенітным агнём і загарэўся, але лётчык змог дацягнуць машыну да нашага тылу і прызямліўся: усе дзеці засталіся жывыя! Сам пілот абгарэў, выратаваць яго не змаглі. Гэта быў яго дзявяты палёт з ушацкага возера.

Сёння на Ушаччыне на месцах былых партызанскіх аэрадромаў устаноўлены памятныя дошкі, а ў музеі захавалася фатаграфія скульптурнай кампазіцыі лётчыка Мамкіна. Спадзяюся, нашчадкі былых франтавікоў і партызанаў увасобяць гэтую ідэю ў помнік, каб нагадаць пра наша гераічнае мінулае, і паставяць яго на вечальскім беразе.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара і з фондаў Ушацкага музея.**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

### ИНФОРМИРУЕТ
### о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому областному потребительскому обществу

**Аукцион состоится** 15.03.2023 **г. в** 11.00 **по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского**, 3, 209. **Телефон для справок** 55-87-71

| Лот № 1 | |
|---|---|
| Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона | ЛОТ 2: капитальное строение, инв. № 400/С-84111 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), площадью 143,2 кв. м, Гродненский р-н, Сопокинский с/с, д. Шинковцы, 21А.<br>Лот № 2 расположен на земельном участке, кадастровый № 422076216601000031, площадью 0,0936 га (назначение – земельный участок для для обслуживания здания магазина), находящемся по адресу: Гродненский р-н, Сопокинский с/с, д. Шинковцы, 21А. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, находящийся в водоохранной зоне водного объекта, код 4.1, площадью 0,0936 га; земельный участок, расположенный в охранной зоне линий электропередачи, код – 13.2, площадью 0,0014 га.<br>Условия проведения аукциона: расходы по государственной регистрации договора купли-продажи, перехода права собственности возлагаются на Покупателя; право собственности переходит к Покупателю после полной оплаты, передачи объекта и государственной регистрации данного права |
| **Начальная цена продажи** | 4 115,14 руб. (четыре тысячи сто пятнадцать рублей четырнадцать копеек) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 411 руб. (четыреста одиннадцать рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 13.03.2023 г. до 15.00** |
| Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 17.09.2021 г. | |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony | |

## Открытое акционерное общество «Стройдетали»

Месторасположение:
Минская обл., г. Вилейка, ул. Стахановская д. 134

**извещает о проведении 28 марта 2023 года ОЧЕРЕДНОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ ОБЩЕСТВА по адресу: г. Вилейка, ул. Стахановская, 134, (помещение столовой)**

**Повестка дня:**

**1.** Итоги финансово-хозяйственной деятельности общества за 2022 год и основные направления развития в 2023 году.
**2.** Утверждение акта аудиторской проверки деятельности общества за 2022 год.
**3.** Утверждение акта ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности общества за 2022 год.
**4.** Утверждение годового отчета, бухгалтерской отчетности за 2022 год.
**5.** Утверждение использования чистой прибыли за 2022 год.
**6.** Утверждение размера дивидендов за 2022 год и сроков выплаты дивидендов.
**7.** Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
**8.** Утверждение размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Начало собрания – в 16.00.
Время регистрации 15.00–15.50.
Для регистрации акционерам иметь при себе паспорт, представителям акционеров – паспорт и доверенность. С информацией о деятельности общества можно ознакомиться в отделе экономики начиная с 07.03 2023 г.
Время работы с 08.00 до 17.00. Обед – с 12.00 до 13.00. Выходной: суббота, воскресенье.
Наблюдательным советом ОАО «Стройдетали» (протокол № 11 от 09.02.2023) принято решение о формировании реестра владельцев ценных бумаг по состоянию на 10.03.2023 года.
Справки по тел.: (8-01771) 2-25-01, 2-25-10.

УНП 600246748

## ОАО «Лидапищеконцентраты»

**сообщает, что 17 марта 2023 года в 11.00 состоится годовое общее собрание акционеров**

Место нахождения общества: г. Лида, ул. Тавлая,11
Место проведения собрания: помещение актового зала, расположенного по адресу: г. Лида, ул. Тавлая, 11

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Лидапищеконцентраты» в 2022 году и основных направлениях деятельности Общества на 2023 год.
2. Отчет наблюдательного совета ОАО «Лидапищеконцентраты» за 2022 год.
3. Отчет ревизионной комиссии о результатах проведенной ревизии за 2022 год и заключение по годовому отчету, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности ОАО «Лидапищеконцентраты». Ознакомление Общества с заключением аудитора.
4. Утверждение годового отчета, годовой бухгалтерской (финансовой) отчетности Общества за 2022 год.
5. Утверждение распределения чистой прибыли за 2022 год. О выплате дивидендов за 2022 год.
6. О направлениях использования чистой прибыли ОАО «Лидапищеконцентраты» на 2023 год.
7. Избрание членов наблюдательного совета ОАО «Лидапищеконцентраты».
8. Избрание членов ревизионной комиссии ОАО «Лидапищеконцентраты».
9. О назначении материального вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Акционеры (их представители) имеют право ознакомиться с информацией (документами), подлежащей предоставлению при подготовке к проведению собрания в рабочие дни с 27 февраля 2023 года по 16 марта 2023 года с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Лида, ул. Тавлая, 11 (приемная секретаря руководителя), а в день проведения Собрания – во время и в месте его проведения.
Регистрация участников собрания – с 10.30 до 10.50 по месту проведения собрания. Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

**Наблюдательный совет.**

УНП 500021268

## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Агросервис» (УНП 700010487, г. Могилев, ул. А. Павлова, 7)

**Аукцион состоится 20.03.2023 в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352 (офис Организатора аукциона)**

**Лот № 1** – Насос ручной 15 А, 65 шт.; манометр МД 13Б, 73 шт.; домкрат гидравлический, 70 шт.; набор ключей ПИМ1515 Т770-270-72, 72 шт.; трос стальной длина 4 м, d 20 мм, 39 шт.; ключ балонный удлиненный, 45 шт.; монтировка стальная, 45 шт.; ведро 10 л оцинкованные, 79 шт.; канистра 20 л стальная, 75 шт.; цепь для колес ЦПГ 739, ГОСТ 3320, 2 комплекта; пусковое устройство УП-200, 1 шт., резцы токарные, 81 шт.; пушка тепловая газовая ECO, 1 шт.; пушка тепловая газовая 15Н, 1 шт.

Начальная стоимость – 27 847,50 бел. руб. с НДС.
Размер задатка – 2 784,75 бел. руб. Шаг аукциона – 5 %.
